Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

31 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.
ПЯТНІЦА
№ 207 (26320)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Да 1 снежня павінны быць вырашаны ўсе пытанні, звязаныя з рэакцыяй беларускай эканомікі на сусветны крызіс

Пытанні ўнутранай і знешняй палітыкі, у тым ліку ўзаемаадносінаў з Расійскай Федэрацыяй і работы беларускай эканомікі на фоне сусветнага фінансавага крызісу, разглядаліся 30 кастрычніка на нарадзе ў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі. Па традыцыі абмеркаванне актуальных аспектаў унутры- і знешнепалітычнага жыцця адбылося з удзелам шырокага кола прадстаўнікоў зацікаўленых міністэрстваў і ведамстваў.

Абазначаючы тэмы, што выносіліся на нараду, Кіраўнік дзяржавы назваў узаемадзеянне з Расійскай Федэрацыяй, маючае адбыцца пасяджэнне Вышэйшага Дзяржаўнага Савета, цяперашнюю эканамічную сітуацыю ў Беларусі ў сувязі з сусветным фінансавым крызісам, лібералізацыю эканомікі і дэбюракратызацыю дзяржсістэмы.

«Нашы адносіны з Расійскай Федэрацыяй павінны быць больш прадуманымі, арганізаванымі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Пасля пасяджэння Саўбеза прайшла сустрэча з Прэзідэнтам Расіі. Таму першая тэма нашай нарады — вынікі сустрэчы на вышэйшым узроўні з пункту гледжання таго, аб чым мы дамовіліся, каб міністры і Урад, іншыя ведамствы і структуры маглі б дзейнічаць у гэтым ключы ў бліжэйшы час у супрацоўніцтве з Расіяй. Прыкладна ў канцы лістапада нам давядзецца правесці ВДС, і гэта пасяджэнне будзе асаблівым. Я як Старшыня Вышэйшага Дзяржсавета зраблю ўсё для таго, каб унесці ў парадак дня істотныя, змястоўныя пытанні, якія датычацца самага галоўнага ў нашых адносінах. У адваротным выпадку ВДС і праводзіць не варта. Гэта значыць усю «драбязу» мы можам разглядаць у рабочым парадку, а прынцыпова трэба разглядаць тыя пытанні, якія ўплываюць па сутнасці на ўзаемаадносіны паміж нашымі дзяржавамі. А такіх пытанняў нямала», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён нагадаў, што парадак дня пасяджэння Вышэйшага Дзяржсавета пачаў фарміравацца яшчэ да пасяджэння Саўбеза. «На Савеце Бяспекі мы яшчэ раз канкрэтызавалі парадак дня і абмеркавалі многія пытанні нашых узаемаадносінаў з РФ. На ўзроўні прэзідэнтаў іх таксама разглядалі. І цяпер мы дамовімся аб канкрэтных дзеяннях па тым ці іншым накірунку», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт адзначыў, што мае намер заслухаць інфармацыю аб стане спраў у рэальным сектары эканомікі і дзеяннях Урада ў сувязі з сусветным фінансавым крызісам, які адбіваецца на эканамічным развіцці многіх дзяржаў — знешнегандлёвых партнёраў Беларусі.

«Няхай гэта для нас менш актуальна, чым для іншых краін, і гэты крызіс менш за ўсё закрануў Беларусь, але наша рэспубліка не жыве ізалявана. На ўсялякі выпадак трэба рыхтавацца да розных варыянтаў развіцця падзей. Таму вось з гэтых пазіцый і неабходна разглядаць пытанні функцыянавання беларускай эканомікі», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся ў старшыні праўлення Нацыянальнага банка Пятра Пракаповіча цяперашняй сітуацыяй на беларускім фінансавым рынку і тым, наколькі фінансавая сістэма краіны гатова гарантаваць сваю ўстойлівасць на фоне сусветных фінансавых крызісаў.

Пры гэтым Прэзідэнт сказаў: «Я асабліва хацеў бы падзякаваць насельніцтву за тое, як людзі сябе паводзяць у гэтай сітуацыі. Калі, дапусцім, у шэрагу дзяржаў насельніцтва пабегла ў банкі, каб забрать свае грошы, то ў нас працэс адваротны. Насельніцтва давярае банкаўскай сістэме, і, трэба сказаць, што дзякуючы гэтаму ў нас ёсць стабільнасць у дзяржаве».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што бліжэйшым часам ён мае намер падпісаць шэраг дакументаў, якія датычацца гарантый насельніцтву. «Насельніцтва павінна быць упэўненым у тым, што іх укладны ніколі не прападуць. І, безумоўна, я буду патрабаваць выканання тут усіх рашэнняў, якія прымаюцца. Я гаварыў аб тым, што мы адмянялем дэкляраванне па ўкладах: ніхто па кішэнях у насельніцтва не павінен «лазіць», таму што вы бачыце даверлівыя адносіны людзей да дзяржавы. Гэта дарагога каштуе, і мы павінны пайсці насустрач людзям па ўсіх накірунках, у тым ліку і тым, хто прыедзе да нас. Я ўжо гаварыў: да нас едуць замежныя грамадзяне і прапаноўваюць свае грошы, каб мы іх размясцілі ў беларускіх банках. Значыць, людзі давяраюць, і мы павінны людзям давяраць, падтрымліваць іх, дзякаваць не на словах, а на справе», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт выказаў перакананасць у тым, што цяпер неабходна скарыстацца сітуацыяй, якая склалася ў свеце, і зрабіць у Беларусі рашаючыя крокі ў бок лібералізацыі эканомікі і ў цэлым жыцця людзей, дэбюракратызаваўшы ўсю існуючую сістэму кіравання ў дзяржаве.

«Да 1 студзеня ў гэтым плане мы павінны зрабіць максімум. Не трэба прыгожа «афармляць» нейкія пытанні. Бачым, з'явіліся пытанні, дапусцім, з дэкларацыяй (людзі не надта ўжо любяць, калі ў іх пытаюцца, адкуль яны ўзялі грошы) — давайце знімем гэта пытанне, не будзем у іх пытацца. Бачым, што ёсць праблема з рэгістрацыяй прадпрыемстваў, бюракратыя задавіла (людзі хочуць працаваць, а мы ім бюракратычныя перашкоды ствараем і задаём лішнія пытанні) — давайце гэту сістэму дэбюракратызуем аж да заявачнага прынцыпу рэгістрацыі прадпрыемства. Хоць бы, дапусцім, па тых накірунках, дзе апасацца няма чаго, напрыклад, звязаных з вытворчасцю і паслугамі. Гэта значыць нам пад гэты момант трэба зрабіць тое, чаго мы заўсёды баяліся, і тое, чаго не рабілі раней. Няпраўда, што свабодная эканоміка і рынкавыя адносіны ў плане канкурэнцыі, вызвалення магчымасцяў чалавека — гэта дрэнна. Гэта яны няхай так думаюць, яны (на Захадзе) дапрацаваліся да таго, што «ўгробілі» рынкавую эканоміку і дэвальвавалі гэтыя паняцці. Мы да свабоднай эканомікі ішлі спакойна, павінны ў гэтым напрамку і далей ісці спакойна. Няма нічога дрэннага ў тым, што ў нас будзе эканоміка без лішняй абузы і путаў, у гэтым няхай небяспекі няма. Таму што асноўныя рычагі ў кіраванні эканомікай і іншымі галінамі мы не страцілі. У гэтым накірунку нам трэба імгненна дзейнічаць — гэта дасць вельмі добры вынік. Людзі ж ва ўсім свеце ўбачылі, якая краіна чаго вартая і якая мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця больш прымальная. Беларусь у гэтым плане выгадна выглядае, трэба людзям даць гэту альтэрнатыву і даць без бюракратычных затрымак», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Ад сусветнага фінансавага крызісу Беларусь можа і павінна мець пэўную карысць, і перадумовы для гэтага ёсць. У гэтай сувязі Прэзідэнт даручыў Ураду да 1 снежня вырашыць усе пытанні, звязаныя з рэакцыяй беларускай эканомікі на фінансавае бязладдзе на сусветных рынках. У прыватнасці, будуць скарэктаваныя экспартныя патокі тавараў і пашырана геаграфія рынкаў збыту. «Тавар неабходна несці прама спажыўцу», — заўважыў наконт гэтага Аляксандр Лукашэнка. А ўсе прадпрыемствы павінны працаваць у звычайным для сябе рэжыме.

Сітуацыя ў сусветнай эканоміцы, паводле слоў Прэзідэнта, — гэта падстава яшчэ раз нагадаць адказным асобам, кіраўнікам усіх рангаў аб неабходнасці дабівацца максімальнай эфектыўнасці гаспадарання. У тым ліку — праз больш жорсткі кантроль за расходаванням бюджэтных сродкаў і змяншэнне сабекошту прадукцыі. Высокая выканальніцкая дысцыпліна і адказнасць — гэта таксама ляжыць у аснове дасягнення высокіх эканамічных вынікаў.

Прэзідэнт запатрабаваў ад Урада дзейнічаць максімальна хутка, каб з выгадай для краіны выкарыстаць сітуацыю ў сусветнай эканоміцы.

Кіраўнік дзяржавы таксама даручыў да 1 лістапада завяршыць усе асенне-палявыя работы, за выключэннем уборкі кукурузы на зерне і пад'ёму зяблёва.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ІВАН — ПІЛІПАЎ СЫН

Цераблічы ляжаць на «тым» баку Прыпяці, але на «гэтым» бераз Моствы. Рака Моства, калі ўважліва паглядзець на карту — гэта мяжа, за якою да самай Украіны населеных пунктаў няма, а толькі балоты і балоты. У паміжрэччы, па сутнасці, размясціўся ўвесь Столінскі раён, але вёска Цераблічы — з крайніх, бліжэйшых да памежжа, што якраз і адпавядае рубрыцы «Абрысы Айчыны». Даследчыкі матэрыяльнай і духоўнай спадчыны лічаць, што Століншчына — гэта магутны этнакультурны пласт са старажытнымі і дагэтуль жывымі каранямі. Мова, поўная дыялектаў, архітэктура, прылады працы, характэрныя рамёствы, культавыя традыцыі і абрады — яно ўсё на паверхні і арганічна знітавана з сучаснасцю. І першая прычына гэткай столінскай захаванасці — менавіта прыродныя ўмовы, якія і вызначалі паводзіны людзей, тыпаж і рысы твару. Цераблічы, як і суседнія памежныя вёскі Кароцічы, Аздамічы, Мочуль, Велямічы (пальцаў адной рукі хапае пералічыць) верагодней за ўсё ўзніклі на месцах, асвоеных старажытнымі плямёнамі, і вядуць свой адлік з дахрысціянскіх часоў. Кожная з гэтых вёсак мае сваю ўласную характарыстыку ў неафіцыйнай назве, як і кожны жыхар завецца адпаведна старажытнаму роду. Цераблян спрадвеку называлі «керкунамі» (назва паходзіць ад паводзінаў дзікай качкі).

Але шырокую вядомасць вёска набыла ў наш час дзякуючы ўнікальнаму мастаку-разьбяру, які жыве тут ад нараджэння і стварае драўляныя скульптуры толькі адным інструментам — сякерай. Ніякіх іншых прылад і разцоў гэты мастак не прымяняе і не прызнае. Такіх умельцаў у краіне сапраўды больш няма. Наступныя эпітэты пра яго не мною, дарэчы, прыдуманы: Іван Супрунчык — адметнасць нацыянальнай культуры, лічаць этнографы, супрацоўнікі Акадэміі навук і чыноўнікі Міністэрства культуры. Яго працы — творы высокай мастацкай вартасці, іх захоўваюць многія музеі краіны, а прозвішча — у энцыклапедыях, каталогах і навуковых манаграфіях. Сапраўды, кожны беларускі этнограф лічыў за гонар даехаць да Цераблічаў і «адкрыць» свету Івана Супрунчыка. А ён, нягледзячы на сваю знакамітасць, здолеў застацца самім сабою, са сваім непадробным стылем жыцця і творчасці, у спрадвечным коле штодзённых вясковых клопатаў. Не кідаўся ў горад «рэалізавацца» і «раскрываць» свой талент. Не дамагаўся званняў і прывілей. Але дзякуючы гэтаму чалавеку сёння ў Цераблічах ёсць самабытны музей, а ў вёску вядуць турыстычныя маршруты.

(Заканчэнне на 6-й стар.)

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

НАДВОР'Е ПАКУЛЬ ПЕСЦІЦЬ

У выхадныя на тэрыторыі Беларусі будзе гаспадарыць малаактыўны антыцыклон, таму ў гэтыя дні пераважна без ападкаў, толькі ў суботу па Брэсцкай вобласці чакаюцца невялікія дажджы, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый Рабаў.

У нядзелю на фоне павышанага ціску месцамі магчымыя невялікія кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ў выхадныя ўначы 4—10 градусаў, у Віцебскай вобласці месцамі толькі 1—3 цяпла; удзень 7—13, па поўдні краіны — да плюс 15 градусаў. У першай палове наступнага тыдня да нас завітае вялікі антыцыклон, які ўсталюе стабільнае сухое надвор'е. Да серады ўключна ападкаў не прадбачыцца ўвогуле. Уначы і раніцай туман. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад 1 цяпла па поўначы да плюс 8 градусаў на поўдні краіны, пры праясненнях замаразкі 0 — мінус 2 градусы. Тэмпература ўдзень ад 6 па поўначы да плюс 14 градусаў па поўдні. Нагадаю, што апошняе кароткачасовае «бабіна» лета назіралася пазаўчора ў Брэсцкай вобласці, дзе ўдзень было ажно плюс 20 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

ПРА РУХ ТРАНСПАРТУ Ў СВЯТЫ

У сувязі з надыходнымі святамі пасажырам трэба ўлічваць магчымыя змяненні ў рабоце транспарту, якія могуць адбыцца ў гэтыя дні.

У прыватнасці, паводле інфармацыі КУП «Мінсктранс», з 6 па 9 лістапада работа міжгародняга аўтобуснага транспарту будзе арганізавана па графіку: 6 лістапада — па раскладзе пятніцы, 7 — суботы, 8 — будных дзён (серады), 9 лістапада — нядзелі.

Аўтобусны прыгарадны транспарт будзе курсіраваць 6 лістапада — па раскладзе пятніцы, 7 і 8 — суботы, 9 лістапада — па раскладзе нядзелі. Як будзе працаваць у гэтыя ж дні сталічны камунальны пасажырскі транспарт? Гарадскія аўтобусныя маршруты 7 і 9 лістапада — па графіку нядзелі, 8 лістапада — па графіку суботы. Для тралейбусных і трамвайных маршрутаў 7 і 8 лістапада будзе дзейнічаць графік суботы, 9 лістапада — нядзелі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

СЭРЦА СПЫНЯЕЦЦА ЧАСОВА

З гэтага панядзелка ў Магілёўскай абласной бальніцы праходзяць аперацыі на спыненым сэрцы. Такое адбываецца ўпершыню ў гісторыі гэтай медыцынскай установы.

Для навучання і падтрымкі магілёўскіх кардыяхірургаў прыбыла і працуе брыгада сталічных спецыялістаў на чале з намеснікам дырэктара па хірургічнай дапамозе Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Кардыялогія» прафесарам Вячаславам Янушкам.

У першыя тры дні аортакаранарнае шунціраванне зрабілі васьмі пацыентам. Аперацыі на спыненым сэрцы першымі паспрабавалі мужчыны, сярэдні ўзрост якіх 50 гадоў. Раней яны перанеслі інфаркты, пакутавалі на стэнакардыю і мелі перспектыву стаць інвалідамі.

— Аперацыі прайшлі паспяхова, усе пацыенты адчуваюць сябе нармальна, — паведаміў галоўны ўрач абласной бальніцы Анатоль Мядзведнік. — Мужчыны, якіх прааперыравалі ў панядзелак, ужо нават актыўнічаюць. На гэтым тыдні будзе яшчэ тры аперацыі.

Цяпер у Магілёўскай абласной бальніцы ёсць асобнае кардыяхірургічнае аддзяленне, разлічанае на 25 месцаў, плюс яшчэ 6 рэанімацыйных. Аддзяленне працуе два гады, аперацыі на працуючым сэрцы тут праводзяцца.

Раней усе магілёўскія пацыенты стаялі ў чарзе і адпраўляліся на аперацыі ў Мінск. Спецыялісты разлічылі, што вобласці з насельніцтвам у 1 мільён чалавек патрэбна 800 аперацый на сэрцы ў год. Аддзяленне ў Магілёўскай бальніцы замахваецца пакуль на сотню ў год, але і гэта ўжо вялікі прарыў для медыцыны вобласці. Для таго, каб выконваць аперацыі на адкрытым сэрцы, бальніца набыла два апараты штучнага кровазвароту, кожны з якіх каштуе 300 тысяч долараў. Увогуле на тэхнічнае абсталяванне аддзялення кардыяхірургіі выдаткавана каля 4 мільярдаў рублёў.

— Жыццё чалавечае каштуе значна даражэй, — пракаментаваў Анатоль Мядзведнік. — Далей мы будзем працягваць навучанне нашых кардыяхірургаў і ў перспектыве рабіць аперацыі па карэкцыі прыроджаных клапанных парокаў сэрца. Увогуле патрэба ў аперацыях на сэрцы вялікая. Паводле статыстыкі, больш чым палова людзей памірае менавіта ад хваробаў сістэмы кровазвароту.

Ілона ІВАНОВА.

ПА ЖУРАВІНЫ... ДЫ НЕ НА БАЛОТА

Адзін з жыхароў вёскі Малькавічы Ганцавіцкага раёна вырашыў, што чым ісці па журавіны на балота, то лепш украсці іх у свайго аднавяскоўца. Як вырашыў, так і зрабіў. Прыхапіў паўтара пуда тых ягад, але папаўся.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

БЕЗ РОЗГАЛАСЦЯ

Парламенцкі дзённік

На пасады кіраўнікоў пастаянных камісій у ніжняй палаце парламента было па адным прэтэндэнце

З 14 абраных старшыняў камісій Палаты прадстаўнікоў — двое прадстаўляюць найпрыгажэйшую палову чалавецтва, васьмёра ўжо маюць вопыт дэпутацтва, самаму маладому з іх — 34 гады, а найбольш сталаму — 58, тэрытарыяльнае «размеркаванне» атрымалася надзвычай гарманічным — па двое прадстаўнікоў ад кожнай вобласці краіны і сталіцы. Усіх іх абралі безальтэрнатыўна. «Жаночы почырк» цяпер будзе ўласцівы рабоце Камісіі па жыллёвай палітыцы, будаўніцтве, гандлі і прыватызацыі, а таксама Камісіі па працы, сацыяльнай абароне, справах ветэранаў і інвалідаў (у гэтым скліканні іх узначаляць ужо вопытны дэпутат Галіна Палянская і парламентарый-пачаткоўца, у мінулым — гендырэктар «Белбыту», Ганна Лаўрукевіч адпаведна). На чале Камісіі па заканадаўстве і судова-прававых пытаннях — прафесійны юрыст, былы старшыня суда Цэнтральнага раёна сталіцы Мікалай Самасейка.

Віктар Гумінскі з пазіцыі намесніка старшыні Камісіі па нацыянальнай бяспецы падняўся ў новым скліканні на пасаду яе кіраўніка. Яшчэ больш прыкметны кар'ерны рост у Аляксандра Юшкевіча — у мінулым члена Камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ, сёння — яе старшыні. Аналагічныя змены, толькі ў Камісіі па прамысловасці, ТЭК, транспарце, сувязі і прадпрымальніцтве, — і ў Сяргея Сямашкі.

Сяргей Маскевіч, які працаваў у Камісіі па бюджэце, фінансах і падатковай палітыцы (у чацвёртым скліканні яе работу будзе каардынаваць, дарэчы, «навічок» у парламенце — былы старшыня Гродзенскага гарвыканкама Аляксандр Антоненка), цяпер узначальвае Камісію па міжнародных справах і сувязях з СНД. «Ракіроўка» адбылася і з Міхаілам Русым: старшыня Камісіі па аграрных пытаннях у трэцім скліканні, ён цяпер адказны за работу Камісіі па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанні (а яго ранейшую пасаду зойме Сяргей Крыжэвіч, экс-старшыня Клічаўскага райвыканкама). У звыклым званні застаўся Уладзімір Здановіч — старшыня Камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе. Роўна як і Алег Вялічка — кіраўнік Камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Беларусь лічыць перспектыўным супрацоўніцтва з Нікарагуа

Актывізацыя адносінаў Беларусі і Нікарагуа дасць магчымасць пашырыць гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва з краінамі Цэнтральнай і Лацінскай Амерыкі. Аб гэтым заявіў 30 кастрычніка Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з міністрам замежных спраў Нікарагуа Самуэлем Сантасам Лопесам.

«Мы адкрываем новую старонку ў гісторыі развіцця адносінаў не толькі з Нікарагуа, але і з Цэнтральнай Амерыкай у цэлым. З пункту погляду развіцця гандлёва-эканамічных сувязяў, нам важна мець пункты апоры ў гэтай частцы Амерыкі для таго, каб супрацоўнічаць не толькі з вашай краінай, але і праз вас з суседнімі рэгіёнамі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Беларусь сур'ёзна разглядае магчымасці супрацоўніцтва па ўсім спектры адносінаў з Нікарагуа. «Важна, што ў нас з'яўляецца шмат сяброў у Амерыцы, гэта дасць стаўчы вынік з пункту гледжання эканомікі», — сказаў ён.

Прэзідэнт не выключыў таксама, што могуць быць створаны сумесныя праекты з удзелам Беларусі, Венесуэлы, Кубы, Нікарагуа, іншых зацікаўленых дзяржаў. «У нас шмат напрамкаў для супрацоўніцтва...», — адзначыў ён.

Аляксандр Лукашэнка запрасіў Прэзідэнта Нікарагуа Даніэля Артэгу наведаць Беларусь. На яго думку, абмен візітамі на вышэйшым узроўні дапаможа вызначыць асноўныя напрамкі двухбаковага супрацоўніцтва.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Лінія жыцця

КАНІЦКАЯ ВОСЕНЬ

Побач са старажытнымі руінамі ў вёсцы Канічы Касцюковіцкага раёна пабудуюць сучасную ферму

Чырвонае і залатое

...Раіса Цімафееўна Маісеенкава не заўважае навокал маляўнічых развалінаў. Яна на веласіпедзе цягне з крамы муку і цукар: сёлетняй восенню ў Канічах так урадзілі яблыкі, што тутэйшыя гаспадыні не спраўляюцца іх перапрацоўваць.

Усё жыццё Раісы Цімафееўны прайшло ў родных Канічах — у старажытнай вёсцы з багатай гісторыяй. Пенсіянерка з гордасцю паказвае на паўразбураны будынак з цёмна-чырвонай цэглы, які ўпрыгожвае празрыстае золата восенскага лісця. Дрэвы абляпілі сцены, растуць унутры будынка, але не закрываюць высока на фасадзе лічбы — «1914».

— Гэта панскі бровар, — тлумачыць жанчына. — Тут выраблялі віно, піва, спірт. А за савецкім часам была МТС. Усе нашы руіны — гэта рэшткі гаспадаркі паноў Цеханавецкіх, якіх тут не бачылі стагоддзе. Цяпер жа, здаецца, і наша вёска на выміранне ідзе: жыхароў яшчэ багата, але моладзі і дзяцей мала. Вось толькі калі хто прыедзе да нас на старажытнае дойлідства паглядзець...

Раіса Цімафееўна, былы брыгадзір і дэпутат, цяпер шчыруе з яблычным варэннем для дзяцей, якія з'ехалі адсюль. Старэйшы сын пакінуў Канічы нядаўна ў пошуках працы і перспектывы.

Наконт будучыні гэтай вёскі меркаванні пакуль разыходзяцца: некаторыя чакаюць адраджэння Канічаў у сувязі з пабудовай налета сучаснай фермы на тысячу дойных кароў, іншыя сумуюць з прычыны закрыцця мясцовай школы пасля гэтага навучальнага года.

Старажытнасці на агародах

Настаўніца гісторыі з яшчэ дзеючага Каніцкага педагагічнага калектыву школы-садка Ларыса Камкова жыве на беразе сажалкі — у месцы, дзе калісьці стаялі панскія аранжарэі. Гаварыць, што калі жыхары Канічаў на ўласных агародах адкопваюць старажытныя падмуркі, то зусім не лічаць такую падзею за сенсацыю. Маўляў, прызвычаіліся да руінаў, да суседства мінулага і сучаснага.

Аднойчы капанула на падворку і Ларыса: знайшла старажытныя ключы, абломкі прыгожых кветкавых гаршкоў, фрагменты кафлі. Гэтыя знаходкі і сталі пачаткам школьнага музея «Вытокі».

— Ёсць шмат народных паданняў наконт назвы Канічаў, — расказвае настаўніца. — Самае разумнае тлумачэнне — ад кірмашу коней, Конічы. Але самая прыгожая легенда — пра прыгажуню Каню і яе трагічнае каханне. Нібыта да паніча, якому не дазволілі жаніцца высакародныя бацькі. Альбо да простага хлопца, якога застрэліў таксама закаханы ў яе паніч. Выбірайце, які варыянт даспадобы. Але фінал адзін: дзяўчына кінулася ў вір на рэчцы. І на нашай Бесядзі сапраўды ёсць Сіні вір.

У 2001 годзе школа стала месцам святкавання 490-годдзя Канічаў. Шкада, што да зусім круглага 500-гадовага юбілею сама школа не дажыве. Сёння тут вучыцца толькі 35 дзяцей, у першы клас пайшлі 4 вучні. І ўсе разумеюць, што трымаць вялікую школу для такой малой колькасці вучняў фінансава нявыгадна.

Міхаіл БАРЫСАЎ, старшыня Касцюковіцкага райвыканкама:

— Новая ферма пабудуецца напрыканцы наступнага года. Увогуле, я упэўнены, што Канічы перажываюць часовыя складанасці. Праўда, у нас няма сілаў і сродкаў, каб аднавіць старажытныя будыніны. Усё, што мы можам, — гэта паставіць харчовы кіёск для людзей, якія паедуць турыстычным маршрутам. Але час наадыдзе і для Канічаў. Руіны дачакаюцца новых гаспадароў.

Дзеці будуць вучыцца ў суседнім аграгарадку Новыя Саматэвічы. Калісьці гэта новае паселішча ўтварылі літаральна ў чыстым полі для перасяленцаў з забруджаных Саматэвічаў. А ў Канічах дасюль шкадуюць, што пасёлак не пабудавалі ў іх вёсцы, дзе было дастаткова вольнага месца і патрэбныя камунікацыі.

У тым выпадку можна было б гучна казаць пра адраджэнне былой велічы Канічаў. А яна сапраўды была. Паводле гістарычнага спіса, на атрыманне сялянамі зямлі пасля адмены прыгоннага права ў Канічах было болей жыхароў, чым у Касцюковічах, якія сёння маюць статус горада і раённага цэнтра.

Канічы нават маюць «вёску-сястру» ў Амурскай вобласці. Выявілася, што на пачатку XX стагоддзя падчас Сталыпінскай рэформы вяскоўцы выехалі за Урал і там заснавалі Канічы. Карта і лісты нашчадкаў перасяленцаў, якія цікавяцца сваімі каранямі, захоўваюцца ў школьным музеі.

Буслы над касцёлам

У вёсцы Канічы ёсць пасёлкі з назвамі — як у горадзе мікрараёны. Куляшоўка названа прозвішчам першага пасяленца. Можа, гэта быў далёкі сваяк вядомага беларускага пісьменніка Аркадзя Куляшова, які нарадзіўся непадалёк у Саматэвічах і ўславіў Бесядзь?

А Мястэчкам называецца пасёлішча каля вялікага касцёла. Там сяліліся заможныя людзі, мяшчане. Па-сучаснаму — прэстыжны раён. Яго цэнтр — вялізны гмах касцёла, цяпер паўразбураны.

— У розных крыніцах ён запісаны як будынак другой паловы XIX стагоддзя, але мы з гэтым нязгодныя, — каментуе знаўца мясцовай гісторыі Ларыса Камкова. — Старажылы распавядаюць, што да разбурэння на ім быў надпіс — 1825 год. А назву касцёла ніхто не ведае.

Вядома толькі, што будаўнічую пляцоўку касцёла пераносілі з-за гібелі чалавека. Людзі палічылі гэта дрэнным знакам і пасунуліся ў іншае месца. Цэглу для касцёла перадавалі рукамі праз усю вёску: з цагельні — да будоўлі.

Падчас Другой сусветнай вайны немцы, распавядаюць старыя, з касцёла вывезлі арган і абітыя чырвоным аксамітам лаўкі з моранага дуба. Не захаваліся да нашых дзён шыкоўныя вітражы і каштоўныя фрэскі. Аднак і сёння, калі ад касцёла застаўся толькі касцяк з цэглы, ён робіць вялікае ўражанне сваёй велічу, вялізнымі памерамі.

Над алтаром вырасла сасна, а на званіцы з разбуранымі лесвіцамі могуць трапіць цяпер толькі птушкі.

— Штогод буслы гняздуюцца на касцёле і ўсё клякочуць, — расказвае Раіса Маісееўна. — Сёлета ў сям'і было чацвёра птушанят. Раней — толькі двое. І ўсё лета бацькі нястомна працавалі: яна ахоўвала, а ён насіў і насіў ежу. Тут самае бяспечнае месца.

Руіны касцёла, калі можна так сказаць, надзвычай моцныя. Калі б бомба ў вайну не трапіла прама ў касцёл, ён бы і цяпер стаяў. Будаўнічыя растворы за панамі рабілі на яйках і тварагу, вапну вытрымлівалі гадамі. За садавальненні аблазіць усе старажытныя руіны. Нездарма на ўцалелай сцяне касцёла з'явіўся эпахальны надпіс: «Здесь был рэпер».

— У касцёле быў падземны ход, але ён завалены смеццем, — паведаміла 8-класніца Вольга Рыцікава.

— Гаварыць, што падземныя ходы вялі ад касцёла да бровара, — падтрымаў аднакласніцу Слава Мартыненка.

— А прывіды там ёсць?

— Няма, — цвёрда адказалі сучасныя падлеткі. — Мы ніколі не бачылі ў руінах таямнічыя здані, таму што мы ў іх не верым!

Каля касцёла сустрэліся каніцкія жыхары: настаўніца гісторыі Ларыса КАМКОВА і старшыня Бялынкавіцкага сельскага Савета Дзмітрый ЦІМАШЭНКА. У іх руках — знаходкі, зробленыя на вясковых агародах.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Прамая лінія

РАБОТА ПЛЮС «ГАЛОЎНАЕ ПЫТАННЕ»

Кантракты, рэжым працы і адпачынку, водпускі, іншыя нюансы працоўнага заканадаўства, а таксама ўсё, што датычыцца «кватэрнага пытання» і нерухомасці — пастаноўка ў чаргу на паляпшэнне жыллёвых умоў, дарэнне, завяшчанне, атрыманне ў спадчыну маёмасці і яе падзел. Аб усім гэтым і іншым мы прапануем пагутарыць падчас «прамой лініі» **з загадчыкам юрыдычнай кансультацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Уладзімірам Іванавічам ШЭЛКОВІЧАМ і намеснікам загадчыка юркансультацыі ФПБ Васілём Мікалаевічам КОРСУКАМ.**

ТАКІМ ЧЫНАМ, УВАГА! Паводле папярэдняй дамоўленасці, наша «прамая лінія» пройдзе **4 лістапада з 11.00 да 12.30** па рэдакцыйных тэлефонах: **(8 017) 292 38 21 і 292 38 92**. Папярэднія пытанні прымаюцца па нумары **(8 017) 287 17 57.**

Нованароджаных стала больш

У Беларусі за студзень—верасень гэтага года нарадзілася 80 тыс. 661 дзіця — на 4 працэнты больш у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года, паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны. Сярод рэгіёнаў рэспублікі лідзіруе па прыросце колькасці нараджэнняў Мінск (на 7,1 працэнта). На другой пазіцыі ў гэтым своеасаблівым дэмаграфічным рэйтынгу Гомельская вобласць (на 5,2 працэнта), на трэцяй — Магілёўская (4,8 працэнта). Аднак калі ў гарадской мясцовасці нараджальнасць стабільна плюсуе, то ў сельскай — мінусуе.

БЕЛТА.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 31.10.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 119,00
1 еўра	2 793,16
1 латвійскі лат	3 937,56
1 літоўскі літ	809,04
1 чэшская крона	116,00
1 польскі злоты	798,12
1 расійскі рубель	79,83
1 украінская грыўня	300,35

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	26,5430
10 UAH	37,6230
1000 BYR	12,5588
EUR	35,0447

Курс у гандлёвых кампаніях (на 30.10.2008 г.)

USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

«ШТО Ў ВАС ДОБРАГА?»

Вольга АНДРЭЕВА, сямейны псіхатэрапеўт, магістр псіхалогіі:

— Я з задавальненнем кантактую з калегамі, працую з клієнтамі і выкладаю... Усё гэта мне падабаецца. І ў мяне ўсё — добра. У тым ліку ў прыватным жыцці. Нядаўна мы з мужам вярнуліся з адпачынку — аўтамабільнага падарожжа, падчас якога змянялі адзін аднаго за рулём і праехалі амаль 6 тысяч кіламетраў! Мы назвалі гэту паездку «ад мары да мары». Асабіста я здзейсніла пятнаццаць з агульнага спісу мараў... Былі ў Празе, Вене, Зальцбургу... У Аўстрыі жылі ў гарах у сялянскім доме на вышыні 1 тысячы метраў. Потым паехалі ў Мюнхен, Баварскія замкі, на Боданскае возера ў горадзе Канстанц... Наведалі Францыю, пасля чаго вярнуліся назад, у Германію, дзе пабачылі гарады выключнай прыгажосці — Бамберг, Ротэнбург і Нюрнберг. Пасля заехалі ў Берлін, дзе жыве і вучыцца наш сын. Разам наведалі заапарк, атрымалі шмат задавальнення. Потым схадзілі ў музей і падзівіліся на Неферціці... Па вяртанні сюды я зноў прыступіла да работы — дапамагаю кліентам палепшыць іх жыццё, адшукаць разам з імі тыя інструменты, якія дапамогуць жыць у згодзе з сабой. Я, напрыклад, жыву ў згодзе з сабой. І імкнуся не дазваляць знешнім абставінам сапсаваць маё жыццё...

Дзмітрый ДУБІНЧЫК, дырэктар «Завода Ізатрон», г. Ліда:

— Адно з апошніх важкіх дасягненняў прадпрыемства — шырокі выпуск прэпарата рэзістон, запатэнтаванага на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. Прэпарат прызначаны для анкалагічных хворых, якія перанеслі хірургічнае ўмяшанне, прамянёвую або хімічную тэрапію. Рэзістон умацоўвае абарончыя рэакцыі арганізма, аказвае супрацьпухліннае ўздзеянне, затрымлівае рост і метастазаванне раку. Гэта антыаксідантны комплекс вітамінаў, куды ўваходзяць бэта-карацін, аскарбінавая кіслата і іншыя вітаміны. Ноу-хау заключаецца ў асаблівасцях дазіроўкі і змешвання кампанентаў. Па нашай ліцэнзіі і рэцэптуры даччынае прадпрыемства кампаніі BASF вырабляе гэты спецыяльны прэмікс... Клінічныя іспыты рэзістону, праведзеныя ў нашай краіне, паказалі высокую эфектыўнасць у паляпшэнні стану анкалагічных хворых. Гэта, безумоўна, не панацэя ад раку. Гаворка ідзе аб магчымасці падаўжэння жыцця хворага. Адпускаецца па рэцэпце ўрача.

Юрый РАБАЎ, дырэктар Мінскага заапарка:

— Уводзяцца ў эксплуатацыю новыя вальеры для малпаў, капытных і драпежнікаў, а таксама ўдасканальваецца тэрыторыя так званага «дзіцячага заапарку» — адкрытае месца, дзе знаходзяцца козачкі, свінкі, куры і іншыя жывёлы, з якімі могуць кантактаваць дзеці і дарослыя... Такім чынам, істотна паляпшаюцца ўмовы ўтрымання жыхароў заапарка... Плануем завозіць зебраў з Украіны, блакітных гну з Літвы, чырвоных мартышак з Чэхіі, ільвінахвостых макакаў, чырвоных і чорных ваўкоў з Расіі, ламу і камерунскую авечку з Гродзенскага заапарка... Зараз афармляюцца адпаведныя дакументы. Кагосьці з пералічаных прывязём ужо ў кастрычніку — лістападзе...

Запісала Святлана БАРЫСЕНКА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У ЛАТВІІ ЗАБАСТАВАЛІ ЎРАЧЫ

У Латвіі ў чацвер пачаўся страйк медыкаў, арганізаваны Латвійскім прафсаюзам працаўнікоў аховы здароўя і сацыяльнага догляду. Забастоўка працягнецца і сёння.

Медыкі патрабуюць ад дзяржавы павышэння зарплаты. Улады, са свайго боку, адмаўляюцца павышаць выдаткі бюджэту, спасылаючыся на высокую інфляцыю і эканамічны крызіс. Кансультацыі па гэтым пытанні, якія праводзіліся паміж прадстаўнікамі прафсаюза і ўрада Латвіі, вынікаў не прынеслі. Урад плануе новыя скарачэнні расходнай часткі бюджэту, праўда, аховы здароўя яны, як чакаецца, не закрануць. У забастоўцы бяруць удзел 23 медыцынскія ўстановы ў Рызе і іншых гарадах: Даўгаўпілсе, Рэзэкне, Ліепаі. Страйк не распаўсюджваецца на прыёмныя і рэанімацыйныя аддзяленні, а таксама службы хуткай дапамогі.

КОЛЬКАСЦЬ ЗАГІНУЛЫХ У ВЫНІКУ СЕРЫІ ВЫБУХАЎ У ІНДЫІ ПАВЯЛІЧЫЛАСЯ ДА 56 ЧАЛАВЕК

Колькасць загінулых у чацвер у выніку серыі выбухаў у індыйскім штаце Асам склала 56 чалавек, паведамляе агенцтва Associated Press.

Колькасць параненых, паводле апошніх звестак, склала 300 чалавек. Удакладняецца таксама лік выбухаў: іх было 13. Адказнасць за тэракты пакуль не ўзяла на сябе ні адна арганізацыя. Нагадаем, тэракты былі ажыццёўленыя ў Гувахаці і трох іншых гарадах штата Асам. Мішэнню тэрарыстаў сталі крамы, адміністрацыйныя і офісныя будынкі.

НОВАЯ ВАЕННАЯ ФОРМА МОЖА СПЫНІЦЬ КРОЎ ЗА 20 СЕКУНДАЎ

Вытворца ваеннай формы і атрыбутыкі Blackhawk Products Group абвясціў аб стварэнні ўнікальнага касцюма для спецпадраздзялення. Распрацоўшчыкі сцвярджаюць, што ён зможа не толькі абараніць салдата ад агню, але і спыніць крывацёк у выпадку ранення ўсяго за 20-25 секундаў.

Матэрыялы, з якіх зробленая навінка, самыя звычайныя. На 70 працэнтаў яна складаецца з бавоўны, на 30 — з нейлону. Аднак, паводле сцвярджэння вытворцы, яна вытканая такім чынам, што здольная абараніць ад агню. Яшчэ адна вартасць формы ў тым, што яна мае сістэму ўбудаваных жгуто ў, кожны з якіх можна зацягнуць у выпадку ранення, і спыніць крывацёк да моманту аказання медыцынскай дапамогі. Названы і кошт аднаго такога касцюма — 500 долараў.

РАЗ, ДВА — І КВАТЭРЫ НЯМА

Гучная справа

З 2001 ПА 2007 ГОД ШЭРАГ МІНЧАН — АДЗІНОКІХ І САСТАРЭЛЫХ, А ТАКСАМА З ЛІКУ ТЫХ, ХТО ЗЛОЎЖЫВАЕ СПІРТНЫМІ НАПОЯМІ, ПАЗБАВІЛІСЯ СВАІХ КВАТЭР ДЗЯКУЮЧЫ ЗЛАЧЫННЫМ «ПРАДПРЫМАЛЬНІКАМ» РАМАНУ ДРУКАВУ І АНДРЭЮ КІСЯЛЁВУ.

Абодва лаўкачы — маладыя (адзін 1975-га, другі — 1974 года нараджэння), ураджэнцы Мінска, з сярэдняй адукацыяй, жанатыя, беспрацоўныя і, безумоўна, чыста знешне не падобныя на злачынцаў, якім не варта было б давярацца... Ідэйным натхняльнікам махлярства быў Раман Друкаў, які распрацаваў, а пасля паспяхова пачаў рэалізацыю злачыннага плана.

Перш-наперш ён адшукваў патэнцыяльных ахвяраў — збіраў поўную інфармацыю аб слабых у адносінах да выпіўкі грамадзянах і проста пра адзінокіх асобаў, якія мелі «хранічную» запазычанасць па аплаце камунальных плацяжоў. Такую інфармацыю яму ўдавалася атрымаць праз знаёмых у ЖЭСах, ЖРЭА, апорных пунктах раённых органаў унутраных спраў і іншых крыніцах. Дарэчы, сума запазычанасцяў за кватэру дасягала часам 20 мільёнаў рублёў. Зразумела, што такія даўгі ўтвараліся толькі ў пэўнай катэгорыі грамадзян, якія не маглі аплаціць не тое што доўг, але і бягучыя штомесячныя выдаткі.

— Друкаў не проста знаёміўся з патрэбнымі яму кандыдатурамі, але і ўстанаўліваў з імі даверальныя адносіны, нават ахвяраваў нязначныя сумы грошай, «прастаўляў» выпіўку, даваў нейкія прадукты, адзенне, адным словам, выказваў жаданне ўсяляк дапамагаць і падтрымліваць «няшчасных», — тлумачыць **намеснік начальніка галоўнага следчага ўпраўлення папярэдняга расследавання Міністэрства ўнутраных спраў Дзмітрый ДАНІЛЬЧЫК.** — Для пагашэння запазычанасці па камунальных плацяжах Раман Друкаў прапаноўваў просты варыянт: прыватызаваць і прадаць кватэру, пасля чаго «пагасіць» даўгі, набыць іншую кватэру — меншую або ў менш прэстыжным раёне Мінска ці нават за яго межамі...

Першая частка плана выконвалася бездакорна. Друкаў, а праз некалькі гадоў да яго «дзейнасці» далучыўся і Кісялёў, рыхтавалі кватэры да продажу — аплачвалі запазычанасці па кватэрнай аплаце, камунальных плацяжах, бралі на сябе выдаткі па атрыманні дакументаў і натарыяльным засведчанні здзелак, падбіралі асобаў, якія пагаджаліся стаць фіктыўнымі ўласнікамі кватэры, усяляк спрыялі зняццю забароны раённых адміністрацый на адчужэнне кватэр, зняццю асобаў, якія пакутуюць на алкагалізм, з уліку ў наркалагічным дыспансэры. Абодва дастаўлялі пацярпелых ва ўсе належныя інстанцыі для атрымання дакументаў па падрыхтоўцы кватэр да прыватызацыі, продажу і г.д.

Да заключэння дагавора куплі-продажу на новага ўласніка ўладальнікам кватэр паказвалі будучае жыллё. Гэта была адна і тая ж гарадская кватэра, якую больш пацярпелыя, безумоўна, не бачылі. Як толькі прадпрымальныя асобы авалодвалі грашыма, выручанымі ад продажу маёмасці, яны набывалі абсалютна непрыдатнае для пражывання «жыллё» або наогул нічога не набывалі.

Часам да падпісання дагавора жыхарам прапаноўвалася пажыць на часовай кватэры. Маўляў, іх «роднае» жыллё патрабуе падрыхтоўкі да продажу. Падрыхтоўка спраўды праводзілася — з кватэр усё выкідвалася або раздавалася суседзям. Пасля продажу ахвярам падману гаварылі, што новыя «пакоі» яшчэ не гатовыя — таксама патрабуюць рамонтнага ўмяшання.

— Па дакументах наўмысна заніжаўся кошт кватэр, якія ішлі на продаж, — кажа Дзмітрый Данільчык. — І адначасова завышаўся кошт тых, што набываліся. У злачынцаў атрымлівалася, быццам, за грошы, атрыманыя ад продажу 2-3-пакаёвай сталічнай кватэры немагчыма набыць меншую. У рэдкіх выпадках ахвярам падбіраліся баракі ў Мінскай вобласці...

У рэшце рэшт пацярпелыя заставаліся без свайго даху над галавой, без маёмасці і грошай. Адна з жанчын пазбавілася нават пенсіі і грашовай кампенсацыі, якую атрымлівала ад нямецкіх уладаў як пацярпелая ад дзеянняў фашыстаў у ваенныя гады. Злачынцы проста ўзялі ў яе даверанасць на права атрымання гэтай сумы...

Друкаў і Кісялёў разлічвалі ў выніку толькі на адно: старыя, з хранічнымі захворваннямі, без сваякоў і блізкіх «кліенты» доўга не пацягнуць, і ніхто, як кажуць, не пацерпіць. Аднак некалькі пацярпелых здагадаліся, што іх падманулі, і звярнуліся ў міліцыю.

Расследаванне ўскладнялася тым, што многія з ахвяраў не мелі пастаяннага месца жыхарства, пяцёра памерлі да ўзбуджэння крымінальнай справы, адзін падчас следства... Арганізатар жа махлярства Раман Друкаў адмовіўся ад дачы паказанняў.

Тым не менш былі сабраныя доказы па 19 эпізодах злачыннай дзейнасці. Страты склалі звыш 900 мільёнаў рублёў. Суд Ленінскага раёна г. Мінска прыгаварыў Друкава да 9 гадоў пазбаўлення волі, Кісялёва — да 7.

Магчыма, прадпрымальныя беспрацоўныя не змаглі б ажыццявіць свае грандыёзныя планы, калі б у нашым грамадстве існаваў дакладны адказ на два пытанні: як удасканаліць механізм спагнання запазычанасці з неплацельшчыкаў кватэр, якія знаходзяцца ў камунальнай уласнасці і якім чынам забяспечыць магчымасць перасялення такой катэгорыі грамадзян у інтэрнаты, прытулкі, дамы састарэлых? З другога боку, варта, напэўна, нагадаць, што здзелкі па куплі-продажу нерухомасці неабходна ажыццяўляць праз рыэлтарскія арганізацыі, якія маюць ліцэнзію на аказанне такіх паслуг. З 2006 года падобныя здзелкі падвяргаюцца абавязковаму страхаванню адказнасці.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Абзац

■ Супрацоўнікі ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю па Гродзенскай вобласці сумесна з байцамі спецпадраздзялення спынілі дзейнасць падпольнай лабараторыі па вытворчасці псіхатропнага рэчыва метамфетамін. 5 жыхароў Гродна былі затрыманыя ў падпольнай лабараторыі ў адной з кватэр абласнога цэнтра. Усе затрыманыя — наркаманы. Наркотыкі яны выраблялі для асабістага спажывання і для продажу ў начных клубах і на дыскатэках.

■ Сярэдняя зарплата асуджаных у выпраўленчых установах Беларусі складае Br76 тыс. Па звестках пракуратуры, больш за 70 працэнтаў ад агульнай колькасці асуджаных маюць непагашаныя імі іскі. Многія не атрымліваюць матэрыяльнай дапамогі ад родзічаў і не маюць магчымасці падчас адбывання пакарання кампенсаваць урон. Між тым умоўна-датэрміновае вызваленне прымяняецца да тых, хто сплаціў даўгі па ісках. Таму Генпракуратура краіны прааналізавала сітуацыю і прапанавала адпаведным інстанцыям улічваць рэальнае становішча пры вырашэнні далейшага лёсу асуджаных.

■ Вакцынацыю супраць шаленства праводзяць на адной з фермаў Лепельскага раёна. У раённую ветстанцыю звярнуўся дырэктар Лепельскай сортавыпрабавальнай станцыі з падазрэннямі на шаленства каня. Узятыя на аналіз пробы ў жывёліны далі станоўчы вынік. Для папярэджання ўспышкі захворвання ўся буйная рагатая жывёла (62 галавы), а таксама тры супрацоўнікі, якія кантактавалі з хворай жывёлінай, праходзяць вакцынацыю. На ферме аб'яўлены каранцін.

■ У Вене звольнілі з працы вагонаважатага, які павітаўся з пасажырамі нацысцкім лозунгам «Sieg Heil!». Так ён звярнуўся праз мікрафон да пасажыраў. Тыя сустрэлі словы 39-гадовага чалавека з неадабрэннем. Тады вадзіцель сказаў: «Вы што, жартаў не разумееце?» і прынёс свае прабачэнні. Аб выпадку напісала яўрэйская газета, што выходзіць у Вене. Вадзіцеля звольнілі з працы. Калі яго прызнаюць вінаватым — у Аўстрыі выкарыстанне нацысцкіх сімвалаў з'яўляецца крымінальным злачынствам — яму пагражае да 10 гадоў турмы. Нямецкае «Sieg Heil!» перакладаецца як «Няхай жыве перамога!». У 1930-х гадах і пазней нацысты выкарыстоўвалі фразу як прывітанне.

■ У ЗША 56-гадовая жыхарка Кліўленда ў выніку экстракарпаральнага апладнення выносіла трайню сваёй дачкі. Тры дзяўчынкі, дзве з якіх — аднаяйкавыя блізняты — нарадзіліся больш чым на два месяцы раней тэрміну і важылі па 1,4 кг кожная. Аднак урачы лічаць, што зараз іх жыццю нічога не пагражае. Медыкі расказалі, што бацькі дзяўчынак не маглі мець дзяцей і хацелі ўсынавіць каго-небудзь. Але сурагатнай маці для сваіх унукаў вырашыла стаць бабуля.

Поўны абзац

■ Жыхар Малайзіі прадстаў перад судом па абвінавачванні ў спробе прычыніць шкоду суседу з дапамогай сараканожак і жукоў. Згодна з матэрыяламі справы, 21-гадовы Р. Прабакаран залез у дом суседзяў праз дах і падклаў яму ў пасцель 4 сараканожак і жменьку іншых насякомых. Суддзя кваліфікаваў учыненае як спробу прычыніць шкоду з дапамогай небяспечнай зброі і пакуль адпусціў падазронага пад заклад. Калі Прабакарана прызнаюць вінаватым, яму пагражае пабіванне палкамі і 3 гады турмы. Чым быў выкліканы канфлікт суседзяў, не ўдакладняецца, як і від сараканожак.

■ На аперацыю па выратаванні марскога анёла Лонданскі акварыум патраціў 500 фунтаў стэрлінгаў. Падчас аперацыі рыбцы па імені Карла выдалілі грыжу. Аперацыю над 25-сантыметровым стварэннем ветэрынар праводзіў па ўсіх правілах — з выкарыстаннем анастэзіі, скальпеля, пінцэта, іголкі і нітак у прысутнасці двух памочнікаў. Праз жабры рыбы падчас паўтарагадзіннай аперацыі пампавалася вада — кав тая магла дыхаць. Цяпер Карла папраўляецца. Супрацоўнік акварыума, дзе рыбка пражыла 10 гадоў, расказаў: «Я разумею, што гэта крыху здзіўляе, калі аперацыю праводзяць маленькай трапічнай рыбцы. Але яна для нас — амаль частка сям'і».

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

БЕЗ РОЗНАГАЛОССЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Васіль Байкоў (былы старшыня Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя), знаёмячы дэпутатаў са сваім бачаннем работы Камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце, кіраўніком якой ён учора быў абраны, зрабіў акцэнт на ўдасканаленні заканадаўства, а не на падрыхтоўцы новых праектаў. На яго думку, асноватворныя законы ў сферы дзяржаўнага будаўніцтва ўжо прынятыя ў папярэднія гады. «Неабходна захаваць пераемнасць і такім жа актыўным чынам, як гэта рабілі дэпутаты — члены камісіі мінулых трох скліканняў, працягнуць работу па ўдасканаленні заканадаўства ў сферы дзяржаўнага ладу, мясцовага самакіравання, выбарчай сістэмы, адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ладу, прававога статусу дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і мясцовых Саветаў дэпутатаў», — адзначыў новы старшыня камісіі.

Абраны старшынёй Пастаяннай камісіі па грашова-крэдытнай палітыцы і банкаўскай дзейнасці Яўген Арцюшэнка (яшчэ нядаўна намеснік гендырэктара Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода) упэўнены: «Неабходна фарміраваць, удасканальваць тую нарматыўную базу, якая створыць інфраструктуру для нармальнага эканамічнага росту, для канкурэнтаздольнасці беларускай эканомікі». Ён прызнаў, што сёння дастаткова шмат складаных пытанняў менавіта ў фінансавай сферы — «гэта звязана і з тымі высокімі тэмпамі эканамічнага росту, якія ёсць у нашай краіне, і з тымі выклікамі, якія ёсць у Рэспубліцы Беларусь у сувязі з глабальным фінансавым крызісам, і ў сувязі з тым, што неабходна адэкватна рэагаваць на знешнія праблемныя сітуацыі».

Уменне паказваць работу камісіі ў СМІ падкрэсліў Уладзімір Здановіч, ён таксама звярнуў увагу на патрэбу ў распрацоўцы нарматыўных прававых актаў, якія б рэгулявалі дашкольную і паслядыпломную адукацыю. «У спешным парадку трэба распрацоўваць закон аб інавацыйнай дзейнасці, які патрэбны нашай дзяржаве», — дадаў дэпутат. Паводле яго меркавання, ужо прыспеў час пераходзіць да кадыфікацыі заканадаўства ў сферы культуры. «На падыходзе Кодэкс законаў аб адукацыі — гэта вельмі сур'ёзны дакумент, і ён патрабуе сур'ёзнай работы. Калі мы адолеем яго, то Рэспубліка Беларусь стане першай у свеце краінай, якая будзе мець такі паўнаважкі дакумент».

Сяргей Крыжэвіч згадаў, што пакуль нявырашанымі застаюцца пытанні заканадаўчага забеспячэння АПК — «гэта і цэнавая палітыка, і эканамічная самастойнасць, і адказнасць таваравытворцаў, стварэнне ўмоў стымулявання працы. Не ўрэгуляваныя заканадаўча пытанні сацыяльнай абароны кадраў масавых прафесій, а таксама спецыялістаў і кіраўнікоў. Пакуль што недасканаласць прававая база для арганізацый з новымі формамі гаспадарання, якія займаюцца не толькі вытворчасцю прадукцыі, але і яе перапрацоўкай, захоўваннем і гандлем». На думку новага старшыні, «работа Камісіі па аграрных пытаннях як частка заканатворчай дзейнасці Палаты прадстаўнікоў павінна стаць фактарам павышэння эфектыўнасці сельскагаспадарчай вытворчасці, фактарам выканання ўсіх прынцыпаў поўнага гаспадарчага разліку, выхаду ўсіх суб'ектаў гаспадарання АПК не толькі на самаакупнасць і рэнтабельнасць, але і на самафінансаванне». Ён таксама адзначыў, што далейшае развіццё заканадаўчай базы ў аграрнай сферы дае падставу гаварыць аб «планаванні распрацоўкі аграрнага кодэкса».

Неабходнасць актыўнага ўключэння Камісіі па прамысловасці, ТЭК, транспарце, сувязі і прадпрымальніцтве ў працэс выканання праграмы развіцця лагістычнай сістэмы ў Беларусі падкрэсліў Сяргей Сямашка. Ён патлумачыў, што стварэнне лагістычных цэнтраў прывядзіць да зніжэння транспартнага складніку ў кошце тавараў, а таксама атрымання дадатковага прыбытку з-за прыцягнення транзітных грузаў. «Нам давядзецца развязаць клубок праблем, звязаных з падрыхтоўкай законапраекта аб малым і сярэднім прадпрымальніцтве — гэта вялікая карпатлівая работа, і вельмі важна знайсці раўнавагу інтарэсаў прадпрымальнікаў і дзяржавы», — запэўніў калег дэпутат.

Учора быў сфарміраваны таксама Савет Палаты прадстаўнікоў, натуральна, у яго складзе — спікер ніжняй палаты Уладзімір Андрэйчанка, яго намеснік — Валерый Іваноў, а таксама 14 кіраўнікоў пастаянных камісій, якіх учора абралі дэпутаты. Персанальны ж склад гэтых камісій будзе зацверджаны сёння. Пакуль што карціна досыць кантрасная — шляхам пайменнага электроннага галасавання намер працаваць у Камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі выказала 13 народных абраннікаў, а вось ахвотнікаў займацца аграрнымі пытаннямі, наадварот, знайшлося толькі двое.

Ала МАЧАЛАВА.

ТАКІ ВОСЬ ЛІЦЭІСТ

Вечарам па 3-м Савецкім завулку, што ў цэнтры Баранавічаў, на 40-гадовага жыхара Брэста напаў невядомы. Напачатку ён збіў госця, а затым забраў у яго 18 тысяч беларускіх.

Па гарачых слядах нараду міліцыі ўдалося затрымаць рабаўніка. Ім аказаўся навучэнец Баранавіцкага дзяржаўнага ліцэя. Нарабаваў мала, а атрымаць можа многа.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ВІЗЫ Ў ПОЛЬШЧУ ПАТАННЕЮЦЬ

Беларусь вітае рашэнне Польшчы з 1 лістапада 2008 года знізіць кошт візаў для беларускіх грамадзян.

Аб гэтым заявіў прэс-сакратар МЗС Беларусі Андрэй Папоў. Ён пацвердзіў, што адпаведная нота атрымана беларускім знешнепалітычным ведамствам. Такім чынам, з 1 лістапада кошт афармлення польскай візы для грамадзян Беларусі складзе 20 еўра замест 35 еўра, якія плацілі беларусы са снежня 2007 года. Андрэй Папоў нагадаў, што «Беларусь яшчэ з 21 снежня 2007 года знізіла кошт афармлення беларускіх візаў для грамадзян Польшчы».

БЕЛТА.

Спорт-тайм

У 1/8 — БЕЗ СЕНСАЦЫЙ

У межах розыгрышу Кубка Беларусі па футболе адбылося пяць матчаў першага раўнда 1/8 фіналу. Ніхто з малодшых па рангу не змог дасягнуць поспеху. Вынікі: «Шахцёр» (Салігорск) — «Камунальнік» (Слонім, Д2) — 5:0, «Дынама-Белкард» (Гродна, Д2) — «Нёман» (Гродна) — 0:4, «Белшына» (Бабруйск, Д2) — «Граніт» (Мікашэвічы) — 1:4, «Хваля» (Пінск, Д2) — «Гомель» — 0:2, «Нафтан» (Наваполацк) — «Лакаматыў» (Мінск) — 3:0. 11 кастрычніка БАТЭ прайграў на сваім полі «Мінску» (Д2) — 1:4, а 12 кастрычніка сталічны МТЗ-РІПА разграміў «Смаргонь» — 4:0. 4 лістапада згуляюць «Віцебск» і жодзінскае «Тарпеда». Матчы ў адказ 1/8 фіналу пройдуць 2 і 20 лістапада.

«ДЫНАМА» ВЫЙГРАЛА ХАТНІ МАТЧ

У чарговым матчы чэмпіянату Кантынентальнай хакейнай лігі мінскае «Дынама» перамагло тальяцінскую «Ладу» з лікам 3:1. Галоўны трэнер «Дынама» Васіль Спірыдонаў на прэс-канферэнцыі падзяліўся меркаваннем аб гульні: «Я добра ведаў, што такое тальяцінская «Лада». Удзячны хлопцам, што яны строга выконвалі трэнерскае заданне і дасягнулі поспеху. Задаволены, што ў нас з'явілася звяно-лідар. Тройка Андрэя Міхалёва, з якім разам выступае Яраслаў Чупрыс і Сяргей Дзямагін, закінула чатыры шайбы ў апошніх двух паядынках. Міхалёў — сапраўдны капітан».

МАРАДОНА — ЗНОЎ У ЗБОРНАЙ

Дыега Марадона, паводле папярэдняй інфармацыі, назначаны галоўным трэнерам зборнай Аргенціны, а Карлас Б'янкі — генеральным дырэктарам каманды. «Мая асноўная работа будзе заключацца ў тым, каб назіраць за гульцамі», — сказаў Марадона. «Мне трэба паразмаўляць з кожным асабіста, а ўжо затым мы прыступім да трэніровак. Грандона (прэзідэнт Аргенцінскай футбольнай асацыяцыі) хоча, каб у зборнай працавалі мы ўдваіх — я і Карлас Б'янкі. Я буду назіраць за футбалістамі, каб зразумець, хто знаходзіцца ў лепшай форме». Адзначым, што афіцыйных заяў ад Аргенцінскай футбольнай асацыяцыі пакуль не паступала.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ
объекта долевого строительства

ООО «ДИНАСИСТЕЙТ» информирует юридических и физических лиц о создании **объекта долевого строительства.**

ЗАСТРОЙЩИК (заказчик) – ООО «ДИНАСИСТЕЙТ»

Зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 28 сентября 2000 г. № 1097, в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100984486. Застройщиком осуществлено строительство жилых домов по адресу: г. Минск, ул. Крупская, д. 23 и д. 25, ул. Кулешова, д. 76.

Адрес: 220007, г. Минск, ул. Аэродромная, 125, помещение 1, комната 12, телефон 2245129. Режим работы по вопросам долевого строительства: понедельник—пятница: с 09.00 до 17.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

Цель проекта строительства – исполнение решений Мингорисполкома «Об изъятии и предоставлении земельного участка и разрешении строительства» № 251 от 14 февраля 2008 г. и № 539 (1) от 20 марта 2008 г. на строительство объекта «Жилые дома № 4 и 5 (не относящиеся к домам повышенной комфортности) по генплану по ул. Крупской с устройством административных помещений в цокольных этажах в составе объекта «2-я очередь реконструкции жилой усадебной застройки в границах ул. Плеханова – Малинина – Крупской – прибрежной зоны р. Слепянка».

Объект долевого строительства – жилые дома (ж/д № 4 по генплану – 3-х секционный, ж/д № 5 по генплану – 2-х секционный) представляют собой 4-х этажные жилые дома с размещением в цокольном этаже административных помещений и квартирами на 4-м этаже в двух уровнях. Здания запроектированы на основе безригельной каркасной системы с плоскими монолитными дисками перекрытия. Каркас и перекрытия – монолитный железобетон. Наружные стены и внутренние перегородки – керамзитобетонные блоки. Оконное заполнение и остекление лоджий – изделия ПВХ. Кровля – плоская, покрытие – рулонные материалы. Проезды, площадки, тротуары – асфальтобетон, тротуарная плитка. Для отопления жилого дома принята поквартирная система с установкой индивидуальных газовых котлов. Высота этажа – 2,7 м. Наружная отделка – утепление стен, штукатурка, покраска акриловыми красками. Цоколь здания – облицовка естественным камнем.

Жилая часть: общая площадь квартир за вычетом площади передаваемой Мингорисполкому в счет усредненного сноса – 4781 м² (56 квартир).

Административная часть: общая площадь помещений – 900,86 м² с учетом топочных.

Общая стоимость жилой части и административных помещений в базисных ценах 1991 г. составляет 6608,517 тыс. руб.

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после ввода объекта в эксплуатацию:

межквартирные лестничные клетки, лестницы, вентшахты, коридоры, крыши, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых домов и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в общую собственность дольщиков.

Для заключения договоров долевого строительства предоставляются:

А) Квартиры в жилом доме № 4 по генплану:

- пятикомнатная, четвертый этаж, первая секция, площадь по СНБ 3.02.04-03 – 129,15 м² – стоимость 468 387 180 рублей.

- трехкомнатная, 2 этаж, 2 секция, площадь по СНБ 3.02.04-03 – 86,04 м² – стоимость 289 183 140 рублей.

Б) Административное помещение в цокольном этаже жилого дома № 4 по генплану:

- № 5 третья секция, площадью – 83,4 м² — стоимость 264 711 600 рублей.

Начало строительства многоквартирных жилых домов – 1-й квартал 2008 г., окончание – 2-й квартал 2009 г.

Условия ознакомления застройщиком дольщиков с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству: по согласованию с Застройщиком.

Застройщиком получены:

- разрешение на проведение проектно-изыскательских работ – Акты выбора земельного участка от 11 мая 2007 г. и от 11 сентября 2007 г.;

- решения Минского городского исполнительного комитета от 14 февраля 2008 г. № 251, от 20 марта 2008 г. № 539 (1) о разрешении строительства объекта;

- свидетельство (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права постоянного пользования на него № 500/31-3424 от 03.06.2008 г.;

- свидетельство (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права постоянного пользования на него № 500/31-3425 от 03.06.2008 г.;

- свидетельство (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права постоянного пользования на него № 500/31-3426 от 03.06.2008 г.;

- свидетельство (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права временного пользования на него № 500/31-3427 от 03.06.2008 г.;

- проектно-сметная документация, прошедшая в установленном порядке государственную экспертизу, заключение РУП «Белгосэкспертиза МАС» от 13 февраля 2008 г. № 381-7/08;

- государственная экологическая экспертиза объекта от 20 ноября 2007 г. № 715-2007;

- договор строительного подряда № 25/02-2008 от 19 февраля 2008 г. с ИП «Восточная строительная компания»;

- выданное органом государственного строительного надзора разрешение на проведение строительно-монтажных работ от 26.03.2008 г. № 2-201-Ж-062/07.

Объект находится в залоге у банка для обеспечения исполнения обязательств Застройщика по кредитному договору на финансирование строительства объекта. Застройщик обязуется при условии своевременной и полной оплаты Дольщиком объекта долевого строительства передать его Дольщику свободным от каких-либо обременений.

УНП 100984486

КАНІЦКАЯ ВОСЕНЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Кавярня са скляпеннямі

Драўляная царква Нараджэння Багародзіцы, пабудаваная ў 1863 годзе, стаяла яшчэ дзясятак гадоў таму. Не так даўно яна проста ўпала, асела, засталіся адны сцены і, так бы мовіць, склад дроў. Між тым мясцовае насельніцтва ніводнага кавалка дрэва ад царквы не бярэ на гаспадарчыя патрэбы, бо лічыць гэта цяжкім грахом.

Царква перастала працаваць у 1920-я, там захоўвалі ўгнаенні. Апошняга свята́ра, вельмі адукаванага чалавека і знаўцу замежных моў, улады раскулачылі.

Ад панскага маёнтка, двухпавярховага белага будынка, засталося толькі некалькі камянёў ды алеі са старых ліпаў і клёнаў. Суконную фабрыку, дзе выраблялі прадукцыю з поўсці іспанскіх авечак, з сучаснікаў ніхто і не бачыў.

Затое ў былых гаспадарчых памяшканнях маёнтка і цяпер месціцца вясковая крама. А ў складскім будынку бровара было праўленне саўгаса, якім кіраваў Дзмітрый Цімашэнка. Сёння ён узначальвае Бялынкавіцкі сельскі Савет, але старажытныя скляпенні ў былой канторы паказвае ўсім ціка́ўным.

Ігар МАРЗАЛЮК, загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар гістарычных навук:

— Банальна, але на сёння на ўсё не хапае грошай. Безумоўна, там трэба было б адназначіць комплекс помнікаў, ад археалогіі да архітэктуры. Гэта быў бы выдатны турыстычны аб'ект. Месца вельмі цудоўнае, я яго люблю. І, ведаеце, надзея памірае апошняй. Цяпер будзе праграма па Мсціслаўшчыне, дзе зробяць турыстычны запаведнік. Дасць Бог, можа і тут атрымаецца, рукі дойдуць у дзяржавы.

— У Канічах жыве 350 чалавек, і каля паловы — пенсіянеры, — дае справаздачу старшыня. — Спадзяёмся, што новая ферма ажывіць вёску. Цяпер жа людзі працуюць у школе, лясніцтве, сацыяльнымі работнікамі альбо ездзяць у Расію на будоўлі. Маё перакананне: хто хоча — працу знойдзе і на жыццё заробіць.

Хоць апошняе навасе́лле ў Канічах было больш за дзесяць гадоў таму, а сёлета 14 чалавек памерла і толькі 1 нарадзіўся, Дзмітрый Сяргеевіч спадзяецца на адраджэнне вёскі.

— Такое прыгожае месца: дзве ракі, старажытнасці, грыбы да ягады ў навакольных лясах, чыстае паветра і спакой, — пералічвае выгоды Цімашэнка. — Калі б былі бліжэй да сталіц, ужо даўно прадпрымальныя людзі знайшлі б, як гэта выкарыстаць.

Школьнікі са сваімі настаўнікамі таксама думаюць пра будучыню Канічаў. Яны нават праект прапанавалі: што можна зрабіць з рэшткаў старога бровара. Напрыклад, кавярню.

— Мы пралічылі працэнт разбурэ

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

31 кастрычніка 2008 г. № 41 (144)

ПА-НОВАМУ

ПОПЫТ НА... ВЯСКОЎЦАЎ

У шэрагу гаспадарак — адчувальны недахоп кадраў

Варыянтаў для рэфармавання стратных сельскагаспадарчых прадпрыемстваў у розныя часы распрацоўвалася шмат. Аднак будзем шчырыя — мякка кажучы, далёка не ўсе яны былі паспяховыя. Не дзіўна, што да чарговай спробы «рэанімацыі» вясковых «аўтсайдараў» з удзелам інвестараў многія спачатку ставіліся з недаверам. Аднак такая форма адраджэння вытворчасці і сацыяльнай сферы аказалася даволі эфектыўнай. У шэрагу выпадкаў СВК, якія знаходзіліся на мяжы банкруцтва, сапраўды «акрыялі». Мала таго — асобныя з іх сталі лідарамі ў сваіх раёнах.

Цяжкія рэформы

Заўважных поспехаў на Лёзненшчыне апошнім часам дасягнула гаспадарка «Кляўцы». У 2004 годзе гэты СВК пераўтварыўся ў сельгасфіліял «Віцебскаблдарбуда». Да аб'яднання сельгаскааператыў лічыўся адным з самых бесперспектыўных. Дзяржаўныя сродкі, якія накіроўваліся на яго падтрымку, асвойваліся даволі неэфектыўна.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ПОСЛЕ ВЫСТУПЛЕНИЯ «МС»

РЕШЕНИЕ ВОПРОСА — НА КОНТРОЛЕ

Витебский городской исполнительный комитет сообщает, что вопросы, затронутые в статье «Некультурная» ўскраіна, або Чаму «гарадскія» зайздросцяць вяскоўцам?» (опубликованой 17.09.2008 г.), рассмотрены совместно с заинтересованными службами города.

По существу поставленных вопросов информируем, что выполнить устройство тротуара по ул. 6-я Загородная в соответствии с нормами и требованиями безопасности дорожного движения при существующей ширине улицы не представляется возможным. Ремонт улицы (грейдирование, подсыпка щебнем) выполнен в текущем году.

Что касается транспортного обеспечения, то жители частного сектора (ул. 6-я Загородная, ул. Сельская, ул. Передовая, ул. 1-я и 2-я Целинная) связаны с центром города автобусным маршрутом № 7 «ул. Сельская — Тулово-1», на котором задействованы два автобуса с интервалом движения в час пик 50 минут. В 1-ю смену с конечной остановки выполняются 10 отправлений автобусов, во 2-ю — 9. Последний рейс в направлении центра города осуществляется в 23 час. 6 мин.

Неоднократные обследования пассажиропотока по маршруту № 7 показывают, что существующих рейсов достаточно для перевозки пассажиров данного направления. Расписание составлено с учетом сложившегося пассажиропотока и обеспечивает подвоз пассажиров к месту работы, в лечебные и дошкольные учреждения. Для удобства пассажиров на остановочных пунктах размещено расписание движения автобусов. Кроме этого, на данном направлении задействованы 7 микроавтобусов экспрессного маршрута № 94-Т с интервалом движения 12—15 мин. Вместе с тем, анализ работы коммерческого транспорта в сентябре т.г. показал, что не все перевозчики соблюдают утвержденное расписание движения. Руководству РАТУП «Витебскоблавтотранс» поручено усилить контроль за выполнением рейсов в вечернее время.

Действительно, летом текущего года индивидуальный предприниматель, который являлся собственником павильона, находящегося на конечной остановке автобуса, прекратил свою деятельность. В настоящее время ведется поиск арендаторов с целью открытия торговой точки. Решение данного вопроса находится на контроле в управлении торговли и услуг Витебского городского исполнительного комитета.

Д.Н. ШЕРИКОВ, заместитель председателя Витебского городского исполнительного комитета.

КАМАНДЗІРОЎКА ПА ПІСЬМУ

ФІЛАСОФІЯ РАМАНАВЫХ

Хто падтрымае селяніна-прыватніка?

«...Сёння наша грамадства навучылася больш ці менш нармальна ставіцца да бізнэсменаў, камерсантаў, фермераў. Але застаўся стэрэатып няправільнага ўспрымання нас — сялян-прыватнікаў: маўляў, кулакі, хапугі, ірвачы. І гэты стэрэатып неабходна разбурыць. Сярод нас, безумоўна, сустракаюцца розныя, гэтаксама як і ў асяродку чыноўнікаў, міліцыянераў, урачоў, настаўнікаў і г.д. Да таго ж, прыходзячы на рынак, гараджане часцей за ўсё сутыкаюцца ля прылаўка не з сапраўднымі сялянамі, а з перакупшчыкамі, якія прыкрываюцца даведкамі аб асабістай падсобнай гаспадарцы. А сапраўдны селянін перш за ўсё зарабляе свой хлеб цяжкай працай на зямлі. І гэта праца, і стаўленне яго да гэтай працы нічым не горшыя, чым у герояў «Дажынак»...»

Гэтыя радкі напісаў у рэдакцыю жыхар вёскі Паўлаўка Сяражскага сельсавета Слуцкага раёна Генадзь Раманаў. І менавіта яны прымусілі мяне адкласці ўбок усе рэдакцыйныя справы і ўзяць камандзіроўку ў Слуцк...

Дом Раманавых вылучаецца сярод іншых, паўлаўскіх, тым, што, па-першае, новы, па-другое, абкладзены цэглай. (Не «наварочаны», з балконамі, выкрутасістымі калонамі і кічавымі вежамі, а дабротны, пабудаваны з душой і любоўю.) Па-трэцяе, у двары дома, у адрозненне ад іншых, віруе жыццё.

Паўлаўка — вёска неперспектыўная. Сёння ў ёй засталося ад сілы чалавек пятнаццаць. Аўтобус на Слуцк курсіруе два разы на тыдзень, столькі ж разоў прыязджае аўтакрама. Няма ні дзіцячага садка, ні школы, ні клуба — ды і каму туды хадзіць? Пераважная большасць насельніцтва — пенсіянеры. Шэсць гадоў таму Генадзь Леапольдавіч і Наталля Аляксееўна Раманавы пераехалі сюды, на радзіму бацькоў Наталлі, каб, амаль як у класічнай паэме Коласа, набыць зямлю, прыдбаць свой кут... Выблытацца з «панскіх путаў» Раманавым не трэба было, але ж і свабоды не хапала. Свабоды не ў сэнсе анархіі, а свабоды, за якой стаіць права выбару і ўласная адказнасць за гэты выбар. Знайсці прымяненне свайму нетрывіяльнаму характару, жаданню працаваць творча, выкарыстоўваючы інтэлект у спалучэнні з фантазіяй, у дзяржаўным сектары Раманаў не змог. Дакладней, дзяржаўным установам было цяжка змірыцца з чалавекам, які заўсёды і ва ўсім імкнуўся выйсці за жорстка акрэсленыя рамкі. Паспрабаваў займацца камерцыяй — але так і не здолеў зразумець, як можа сябар, які толькі што сядзеў з табой за адным сталом, цябе ж «падстаўляць»...

Амаль у 40 гадоў Генадзь Раманаў рашыўся на «эксперымент», які цалкам змяніў усё яго жыццё. І стаўленне да зямлі як да асновы гэтага жыцця выйшла на першы план.

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Зямля на Случчыне, лічыць Генадзь Леапольдавіч, не такая, як на Віцебшчыне ці на Гомельшчыне — фантастычная зямля, урадлівая. Да яго на гэтым месцы дачнікі жылі — але ў пару зразумелі, што на зямлі працаваць трэба. І «каробку» недабудаваную разам з участкам саступілі Раманаву па невялікай цане. Але яму, каб па-сапраўднаму разгарнуцца на зямлі, аднаго ўчастка было мала. Ён папрасіў у сельвыканкаме яшчэ адзін, і яшчэ... Балазе, участкі стаялі некранутыя, зарасталі бур'янам. І «дзіваку», які імкнуўся іх акультурыць, пайшлі насустрач.

Генадзь і Наталля Раманавы ўзялі пад сваю «апеку» гектар зямлі — нагадаю тым, хто забыў матэматыку, што гэта 10 000 кв. м. Больш за палову тэрыторыі адвялі пад пасадку гародніны — агуркоў, памідораў, баклажанаў, перцаў, некалькіх гатункаў капусты (у тым ліку пекінскай) і г.д. Праца на зямлі і з зямлёй, як вядома, носіць цыклічны характар — ад моманту падрыхтоўкі глебы і сяўбы да збору ўраджаю праходзіць пэўны перыяд. Такога паняцця, як працоўны дзень, у Раманавых няма — яны працуюць, уласна кажучы, ад цямна і да цямна, падпарадкоўваючыся даўно ўсталяванаму раскладу. Раніцай устаюць у 6 гадзін (летам у 5 гадзін і нават раней). Выйшлі за парог дома — і ўжо на рабоце. Цяпер, калі сілы ўжо «не тыя», працуюць па 12 гадзін у суткі, а некалі «гнуліся» на палетках і па 20 гадзін.

— Калі пачынаецца сезон — а гэта звычайна люты і сакавік — каб атрымаць вынік і зарабіць грошы, неабходна паспець многа. Мы фактычна нічога не бачым, акрамя работы, нават на вяселле да пляменніцы не змаглі паехаць — ратавалі пасевы ад холаду, палілі печкі ў цяпліцах, — расказвае Наталля Аляксееўна.

Сеяць, саджаць, пікіраваць, паліць печкі днём і ноччу... Працэс закладкі будучага ўраджаю на пачатку вясны здаецца бясконцым. «Жывём, як быццам адна работа і ёсць», — гавораць Раманавы. Зямлі не патлумачыш, што табе дрэнна, што ты стаміўся і хочаш адпачыць. Яна не будзе чакаць, а ўвосень аддзячыць добрым ураджаем толькі тых, хто паклаў на яе алтар увесь свой час і, лічыце, здароўе.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ПАСПРАБУЕМ РАЗАБРАЦЦА

МЫ ДА ЖЭСА, ЁН АД НАС?

Хачу жыць у прыватным доме. Што добрага ў гэтых грувасткіх будынінах? Тут, напрыклад, я пастаянна бяру ўдзел у праблемах узаемаадносінаў сям'і, што жыве парай этажоў уверх і кудысьці ўбок... Спачатку чуюцца неразборлівыя спробы жонкі наставіць мужа-«нягодніка» на праведны шлях, потым абавязкова з яго боку «...маць», і следам на падлогу падае штосьці аб'ёмнае... Унутры ў мяне ўсё сціскаецца і не адпускае, пакуль канфлікт не знаходзіць завяршэння.

...А не так даўно, калі «дзеткі» з перыферыі вярнуліся на вучобу ў Мінск, заявілі аб сабе кватэры, здадзеныя ў наём. Да шасці гадзін раніцы — п'яныя «базары» маладых галасоў, віскатанне і музыка, музыка, музыка...

Адным словам, суседзі — гэта так складана...

Можна памяняць кватэру. Але дзе гарантыя, што там на ўсіх паверхах будуць жыць інтэлігентныя людзі? «Інтэлігентныя» — значыць, такія, што ўмеюць ставіць сябе на месца іншага чалавека, разбірацца адзін з адным без крыку і нянавісці.

Пікі суседскай нянавісці абвастраюцца звычайна пры двух сітуацыях — рамонтах і затапленнях. Пакуль ты робіш рамонт, цябе ненавідзіць увесь пад'езд, пакуль рамонт робіць хтосьці іншы, высвятляецца, што ты таксама не на баку таго, каму ёсць за што «наводзіць марафет». Я нават ведаю людзей, якія даўно завяршылі рамонтныя работы, а суседская нянавісць дагэтуль ім «ікаецца». Праўда, у сітуацыі з рамонтам ёсць па меншай меры адзін бок, які выйграе. Іншая справа — затапленне. Тут няма тых, хто ў выйгрышы.

...У адзін звычайны, здавалася б, дзень, на шчыце ў прыбіральні заўважаеш кропелькі вады... Можа, здалося? Але на наступны дзень драўляны шчыт, які прыкрывае трубы і лічыльнікі вады, па-здрадніцку ўспушваецца. На трэці дзень вада пачынае цекчы тоненькімі ручаінкамі... Увесь гэты час ты спадзяешся на пільнасць тых, хто цябе топіць: павінны ж там, наверсе, заўважыць, што ў іх цякуць трубы, краны ці што там яшчэ!? На чацвёрты дзень у прыбіральні становіцца так мокра, што на выхадныя ты выклікаеш сантэхнікаў. Прыходзяць двое працаздольных работнікаў ЖЭСа, ацэньваюць сітуацыю. «Вада адназначна цячэ зверху», — робіш ты выснову і адначасова намёк на неабходнасць падняцца да «верхніх» суседзяў з мэтай адпаведнага агляду. Паверхам вышэй, праўда, нікога не аказваецца дома.

— Што ж, — уздыхаеш ты, — гаспадыня працуе на тэлебачанні, магчыма, будзе толькі ўвечары.

— На тэлебачанні? — ажыўляецца адзін з сантэхнікаў. — Вось і выклікайце тэлебачанне. Няхай сюжэт пра вас зробяць...

— Дзякуй, што падказалі...

Праз тыдзень на кухоннай століе з'яўляецца мокрая пляма з жаўтаватымі краямі. Невялікі ўчастак шпалераў узмок, але не адвальваецца.

— ЖЭС? Накіруйце, калі ласка, тэрмінова слесара-сантэхніка, — вось што такое «метал» у тваім голасе.

— Зараз усе на аб'екце — аварыя... Магчыма, толькі пасля абеду...

— !!?? (у сэнсе, ды наплявать мне на вашу аварыю — у мяне ў самой...)

Менш чым праз гадзіну прыходзіць сантэхнік — адзін, і не з ліку тых, што былі ў мінулы раз.

— Цікава, а чаму вы не накіроўваецеся адразу да суседзяў? — замест прывітання пытаюся я. — Факт майго затаплення зафіксаваны яшчэ тыдзень таму. Ваша задача цяпер — знайсці прычыну і спыніць працяканне вады!

— Не зусім... — спакойна адказвае слесар. — Ваша задача — дамовіцца з суседзямі, каб яны былі дома на момант майго прыходу...

— Няхай гэтым зоймецца дыспетчар, — парырую я. Колькі вы будзеце прыходзіць і любавацца на мой успушаны шчыт? Думаю, калі б затапіла начальніка ЖЭСа, ён не стаў бы па два тыдні запрашаць да сябе сантэхнікаў, адлоўліваць суседзяў і ўпрошваць іх пабыць дома!..

— Адзін наш супрацоўнік паўгода не мог «выплыць» з сітуацыі, таму што зверху жыў п'яніца, які настойліва «тапіў» суседа знізу і не адчыняў дзверы, калі прыходзілі работнікі ЖЭСа, маўляў, у мяне ўсё ў парадку, — тлумачыць слесар.

— Ну дык трэба было паставіць пытанне аб яго высяленні...

— На якой падставе? За кватэру ён плаціў... Тут, шаноўная, можна толькі па-добраму дамаўляцца, — з гэтымі словамі сантэхнік падняўся да суседкі, якой зноў не аказалася дома.

— Вось вам мая парада, — сказаў ён па вяртанні. — Дазваніцеся да суседкі, патлумачце сітуацыю, папрасіце, каб яна пабыла дома, пасля пазваніце нам, і я асабіста адразу прыйду...

Пасля размовы з суседкай высветлілася, што яна таксама «крыху» падмакае. Праўда, у яе — еўрарамонт, і пад пліткай ды навясной столлю нічога асаблівага не бачна. Адзінае, што яна перыядычна заўважала, дык гэта ручаінкі на сцяне ў прыбіральні: «думала, можа кандэнсат збіраецца»... Адным словам, прычына маёй мокрай столі была не ў ёй... не ў яе... Суседка дадала, што яшчэ адным паверхам вышэй маладая сям'я нядаўна выкупіла кватэру і цяпер робіць там рамонт. Мы дамовіліся, што мая суседка зверху дазвоніцца сваім суседзям зверху, пасля чаго я зноў паклічу сантэхніка...

Прычына працякання хавалася ў неахайнай рабоце нанятых маладой сям'ёй работнікаў. Сям'я ж на час рамонту жыла па іншым адрасе. Але шораз, як хтосьці з гора-рамонтнікаў карыстаўся вадой, падмакалі і наша суседка, і мы.

Дзякуй богу, суседзі нашай суседкі аказаліся сумленнымі, інтэлігентнымі людзьмі: не толькі пусцілі сантэхніка для выяўлення прычыны працякання, але прыслухаліся да таго, што ён сказаў: дадзеную прычыну павінен выправіць той, хто яе дапусціў. З тым слесар-рамонтнік

Фота Пятра ФАМІНА.

і развітаўся. «Вінаватыя» адразу знайшлі майстра, а нам, іх суседзям знізу, забяспечылі належную маральную і матэрыяльную кампенсацыю.

Такі «хэпі-энд» магчымы толькі пры двух складніках: упартасці і нахабстве таго, каго топяць, і інтэлігентнасці таго, хто топіць.

Але ж такое спалучэнне здараецца надта рэдка. Вось у адной знаёмай гісторыя была больш працяглай і непрыемнай. Тапілі яе сваякоў некалькі тыдняў, прычым так, што вада лілася, як кажуць, ракой. Нават святло «адрубілася». Сусед зверху выкупіў кватэру, пачаў рамонт, у тым ліку мадэрнізацыю батарэй, якія на нейкі час аказаліся адпіленыя. Час, на жаль, быў перадацяпляльны, так што ЖЭС штоночы праводзіў выпрабоўванне трубаў. У выніку гэтых выпрабаванняў вада ў суседзяў знізу не проста капала, а цякла па сценах... Работнікі, якія вялі рамонтныя работы, нікога ў кватэру не пускалі, а мабільны тэлефон гаспадара не давалі...

...Калі топяць асабіста мяне, я гатовая на многае. Але ўсё ж такі проста цікава, ці можна ў нас цывілізавана «разруліць» простую сітуацыю? Адзінае, што мне ўдалося высветліць — любое спрэчнае пытанне можна вырашыць праз суд. Аднак пакуль той суд ды справа, вада па-ранейшаму будзе працягваць сваю «брыдкую справу». Хто б патлумачыў, як і што павінны рабіць у такой сітуацыі пацярпелы, вінаваты і ўласна ЖЭС?

Напэўна, на гэта пытанне маглі б адказаць супрацоўнікі жыллёвага рамонтна-эксплуатацыйнага аддзела, ці ўпраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі гарвыканкама. Можна было б праясніць сітуацыю і ў адпаведным міністэрстве. На жаль, не давялося. У гэтых работнікаў штодня — пасяджэнні і калегіі, калегіі і пасяджэнні. Людзі працуюць... А я спрабую іх ад работы адрываць. Вось ужо два тыдні.

Вядома, ва ўсіх дзяржструктурах ёсць дні прыёму грамадзян па прыватных пытаннях. Аднак раптам мне патрэбна дапамога ў іншы час? І ўжо не важна, патрэбна гэта дапамога мне як звычайнаму жыхару аднаго са звычайных дамоў або як звычайнаму журналісту аднаго з дзяржаўных выданняў... А калі ў наступны раз затапленне будзе больш моцным, а суседзі акажуцца не надта згаворлівымі? Што рабіць? Адкажыце, калі ласка...

Святлана БАРЫСЕНКА.

ШТО Ў КАШАЛЬКУ?

АЎКЦЫЁН — ДАХОД У ПЕРСПЕКТЫВЕ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Бярэзінскі раён датацыйны. Сёлета за кошт уласных сродкаў мясцовыя сельвыканкамы здолелі папоўніць свае бюджэты на суму, якая склала ад 9 да 23 працэнтаў. Асноўная доля па-ранейшаму прыпадае на падаткі, а канкрэтна на зямельны (48 працэнтаў усіх уласных даходаў), падатак на нерухомасць (44 працэнты), выплаты за арэнду зямлі (2 працэнты), за арэнду памяшканняў (1 працэнт) і дзяржпошліну (5 працэнтаў).

— Сёння на балансе сельвыканкамаў няма ні дамоў культуры, ні дзіцячых садкоў, ні вытворчых памяшканняў — мы перадалі іх профільным структурам і ўпраўленням райвыканкама, таму асабліва здаваць у арэнду няма чаго, — тлумачыць старшыня Бярэзінскага раённага Савета дэпутатаў Ірына Крывашэй. — Падчас курсаў павышэння кваліфікацыі для перайманння вопыту па фарміраванні бюджэтаў пярвічнага ўзроўню я разам з іншымі старшынямі райвыканкамаў пабывала ў Шумілінскім раёне. Мы абмяркоўвалі так званы «віцебскі варыянт», калі падаходны падатак з фізічных асобаў часткова залічваецца ў бюджэты сельвыканкамаў. Зараз цяжка сказаць, ці прымальны іх прыклад для нас. Тут ёсць нюанс: калі гаспадарка, што месціцца на тэрыторыі сельсавета, заможная, моцная, і заробак у яе работнікаў высокі, то адпаведна значнымі будуць і адлічэнні падаходнага падатку ў бюджэт сельвыканкама. А калі гаспадарка слабая і заробак невысокі, то і ўліванні ў сельвыканкамаўскі бюджэт будуць сціплымі.

Што тычыцца аўкцыёнаў, якія для пэўных раёнаў сталі проста залатым дном, для Бярэзінскага рэгіёна яны, хутчэй, «даход у перспектыве». У бліжэйшы час тут плануецца правесці два аўкцыёны — у Бярэзінскім і Паплаўскім сельсаветах, аднак на вялікія прыбыткі пакуль разлічваць не варта. Уся справа — у нізкім кадастравым кошце ўчастка. Паводле слоў Ірыны Крывашэй, затраты на афармленне дакументацыі пакуль што значна перавышаюць кадастравы кошт, таму на сёння правядзенне аўкцыёнаў для сельвыканкамаў нявыгаднае. Попыт на зямлю ёсць, аднак у асноўным у тых населеных пунктах, дзе маюцца добрыя пад'язныя дарогі. Як, напрыклад, у Багушэвіцкім сельсавеце. Там сёння не засталося ніводнага пустога дома — гараджане выкупілі пад дачы. А ўсё таму, што з Багушэвічаў ідзе прамая добраўпарадкаваная дарога на Бабруйск.

Па тэрыторыі Бярэзінскага раёна (Ушанскага, Бярэзінскага, Брадзецкага, Багушэвіцкага, Сялібскага і Дзмітравіцкага сельсаветаў) працякае рака Бярэзіна. Прыгожых краявідаў тут шмат. Яшчэ б добрую дарогу — і колькасць ахвотнікаў набыць тут дом ці ўчастак узрасце ў разы.

— Побач з намі праходзіць траса Мінск—Магілёў, якую цяпер рэканструюе наша спецыялізаваная арганізацыя ДРБУ-31, — тлумачыць старшыня. — На адрэзку да Чэрвеня работы ўжо завяршыліся, і ў Чэрвеньскім раёне адразу ўзраслі цэны на зямлю. Думаю, у недалёкай перспектыве тое ж самае зможам канстатаваць і мы.

Яшчэ адзін стрымліваючы фактар — адсутнасць у гаспадароў дакументаў на нерухомасць і зямлю. Вясковыя жыхары прывыклі абыходзіцца без гэтых «паперак», а калі цяпер з'яўляецца жаданне прадаць сваю хату, узнікае праблема. Прыходзіцца наноў афармляць усю патрэбную дакументацыю на дом і на прысядзібны ўчастак. А гэта — грошы. Аднак, напрыклад, у Міраслаўцы Сялібскага сельсавета сёння мясцовыя жыхары актыўна займаюцца афармленнем афіцыйных папер. Там рака вельмі блізка падыходзіць да населенага пункта і попыт на зямлю высокі. Дзякуючы гэтаму ў Міраслаўцы не засталося ні аднаго пустога дома.

На тэрыторыі раёна размяшчаюцца буйныя лясныя масівы, багатыя на грыбы і ягады. Аднак збор з нарыхтоўшчыкаў пакуль не з'яўляецца крыніцай папаўнення бюджэту першаснага ўзроўню.

— Тут нам трэба падключаць падатковую службу, — разважае Ірына Пятроўна. — Самім нам адсачыць дзейнасць нелегальных нарыхтоўшчыкаў цяжка — тэрыторыя вялікая, лясоў і балотаў шмат. З суседняга раёна прыязджаюць прадпрымальнікі, скупляюць у насельніцтва грыбы, ягады і, натуральна, нідзе не рэгіструюцца, ніякіх падаткаў не плацяць. Арганізаваным закупам займаецца райпа, аднак яно вызвалена ад выплаты падаткаў.

...Адзін з асноўных расходных артыкулаў сельвыканкамаў — добраўпарадкаванне. На гэтыя мэты, паводле падлікаў старшынь, кожнаму сельсавету на год патрэбна каля 30 млн рублёў. Максімальная сума, якую атрымалі некаторыя шчасліўчыкі (на чыёй тэрыторыі сёлета мяркуецца ўвядзенне аграгарадка), склала 15 млн рублёў. Значную дапамогу ў гэтай рабоце аказваюць мясцовыя СВК. У першую чаргу — па ўвядзенні ў севазварот пустых зямельных участкаў. Напрыклад, са студзеня па кастрычнік толькі Сялібскі сельвыканкам перадаў у СВК 119 гектараў кінутых пустых зямель. Некаторыя з іх аказаліся на дзіва ўраджайнымі. Так, на землях ля вёскі Падкамень аўса атрымалі 38 цэнтнераў з гектара.

Паводле слоў Ірыны Крывашэй, да 1 лістапада ў раёне ўсе пустыя землі павінны быць перададзены СВК. Перадача прадугледжвае абавязковую інвентарызацыю, якую немагчыма правесці без землеўпарадчыка.

Раней кожны сельвыканкам меў свайго спецыяліста землеўпарадкавальнай службы, цяпер іх забралі ў раён і за кожным замацавалі па 2-3 сельсаветы. Аб'ём работы землеўпарадчыка значна павялічыўся.

— Падчас наведвання па графіку «сваіх» сельсаветаў ён паспявае толькі аформіць некалькі зямельных спраў, — тлумачыць Ірына Крывашэй, — а на сістэматычную работу часу ў яго не застаецца. Правесці ў сціслыя тэрміны інвентарызацыю ў некалькіх сельсаветах — нават пры дапамозе работнікаў сельвыканамаў — аднаму землеўпарадчыку фізічна немагчыма. Калі раней у кожным сельвыканкаме быў свой спецыяліст землеўпарадкавальнай службы, эфект быў большым. Было б карысна вярнуцца да гэтай практыкі, тады мы зможам навесці парадак на зямлі, разабрацца з кінутымі ўчасткамі.

Інга МІНДАЛЁВА.

Бярэзінскі раён.

ФІЛАСОФІЯ РАМАНАВЫХ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Мы размаўляем некалькі гадзін запар, седзячы ва ўтульнай, зусім не вясковай, а па-сучаснаму абстаўленай зале... Канец кастрычніка — час, калі можна даць сабе маленькае паслабленне. Асноўны ўраджай ужо сабраны і рэалізаваны на рынках — мінскім і слуцкім. Засталася «драбяза» — дагледзець позніх гатункі перцаў і памідораў, якія растуць у цяпліцах і проста на градах... Мне хочацца зразумець, што рухае гэтымі людзьмі, прымушае дзень за днём расходаваць свае сілы, здароўе, час, маладосць у рэшце рэшт... Грошы? Магчыма. Але прапануйце каму-небудзь з вашых знаёмых пераехаць у вёску з мэтай падобнага заробку — пакруцяць пальцам ля скроні. Ды і вяскоўцы — тыя, што ў сельгаспрадпрыемствах працуюць, — перайсці на такі «хлеб» не пагодзяцца. Яны аддадуць перавагу невялікаму стабільнаму заробку і гарантаванаму адпачынку ў канцы рабочага дня. Выключэнне для вяскоўцаў складае хіба што час жніва — канец лета і пачатак восені, калі ўсе калгасы «стаяць на вушах», каб забяспечыць запланаваныя паказчыкі.

Раманавы жывуць у такім «выключным рэжыме» адзіноццаць месяцаў на год, адпачываючы толькі ў студзені. Вясной колькасць пасаджаных каліваў вымяраецца тысячамі і нават дзясяткамі тысяч штодзённа. І гэта практычна ўручную.

— Пачынаем саджаць, заўважце, не ў маі, калі само ўсё расце і прырода чалавеку дапамагае, а ў лютым. Вы ў вучоных спытайце: як пасеяць у лютым капусту і атрымаць ураджай? Яны не адкажуць. І ў нас не заўсёды атрымліваецца. Але ж праз раз атрымліваецца!

На ўвесь Сяражскі сельсавет яны такія адны. Генадзь Леапольдавіч сумна жартуе:

— Мы тут чужыя, «навалач». Ніхто не разумее, навошта нам уся гэта марока. Нават сваякі. Кажуць: ішлі б лепш у калгас, там людзі так не працуюць, і домікі бясплатныя даюць... Ім так прасцей — жыць, як усе. А нам не хочацца.

У кожнага чалавека ёсць шэраг прычын займацца тым, чым ён займаецца. У Генадзя Раманава іх як мінімум пяць.

— Я раблю тое, што мне падабаецца, мая работа — адначасова і маё хобі, што з'яўляецца неверагодная удача. У маім занятку дастаткова месца для творчасці — а гэта дадатковыя хвіліны і гадзіны шчасця. Мой заробак залежыць ад Госпада, маіх здольнасцяў і майго старання, а не ад стаўлення да мяне начальства, я не ўдзельнічаю ў дзялёжцы прэмій і працоўных месцаў, маю́ рыдлёўку ніхто не імкнецца адабраць. Вельмі малы працэнт маіх суайчыннікаў мае большую ступень асабістай свабоды, чым я. І, нарэшце, мае дзеці бачаць, што іх бацькі зарабляюць цяжкай, але сумленнай працай і кланяюцца толькі зямлі.

Раманавы, і Наталля, і Генадзь, упэўнены, што нялёгкая праца — не такая ўжо высокая плата за павагу сваіх дзяцей.

— Ну а самі сябе вы кім лічыце? — цікаўлюся ў Генадзя Леапольдавіча. — Ад прыватных прадпрымальнікаў адхрысціліся і ў іх шарэнгі вяртацца не збіраецеся, так? Да фермераў яшчэ не дараслі... А назваць вашу гаспадарку «падсобнай» неяк язык не паварочваецца — якая ж яна падсобная, калі з'яўляецца для вас асноўнай крыніцай даходаў?

— Мы называем сябе сялянамі-індывідуаламі — пакуль дзяржава не прыдумала для нас ніякай іншай назвы і не прызнала нас афіцыйна. А дарэмна не прызнала. Такіх, як мы, па ўсёй краіне тысяч дваццаць назбіраецца — асабліва на Брэстчыне, на Гродзеншчыне. Наш лад жыцця не вельмі зразумелы сучаснікам, але ён традыцыйны, сялянскі. І калі дапамагчы развіцца дробнаму свабоднаму сялянству, якое «не пан і не слуга», — дык ад гэтага выйграюць і вёска, і грамадства, і дзяржава.

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Ад сахі, сцвярджае народная прымаўка, не будзеш багатым, а будзеш гарбатым. Але годна і нават заможна «з зямлі» жыць можна, лічыць Раманаў. І калі б дзяржава прадаставіла дадзенай сялянскай «праслойцы» адпаведныя прэферэнцыі, людзі з задавальненнем забяспечвалі б сябе самі, не чакаючы «міласці» ад калгасаў. Сёння ж многія трымаюцца за работу ў калгасах, таму што баяцца застацца без «афіцыйнага статусу». Тым жа Раманавым стаж не налічваецца, для дзяржавы яны — «ніхто», звычайныя беспрацоўныя, таму што не плацяць падаткаў (акрамя падаткаў на зямлю і на нерухомасць).

— Я і рады б плаціць, і кажу — прыйдзіце, вазьміце з мяне які-небудзь зафіксаваны падатак. Але ніхто не ідзе! Атрымліваецца, нікому мае падаткі не патрэбныя?

Яму прапанавалі: а ты зарэгіструйся як індывідуальны прадпрымальнік, і ўсё будзе законна. Але Генадзь Леапольдавіч абураецца: як можна параўноўваць заробкі і затраты сельгасвытворцы (да якога ён сам сябе адносіць) і таго ж гандляра-прадпрымальніка?

— Я ўжо некалі быў прыватным прадпрымальнікам па вырошчванні гародніны. Але падатак мне ўстанавілі такі ж самы, як і тым, хто гандлюе на рынках прадуктамі харчавання. І я гэты падатак не пацягнуў... Калі выходзіць з такой «логікі», тады і калгасы павінны плаціць падаткі нароўні з супермаркетамі. Я — не індывідуальны прадпрымальнік, я — сельгасвытворца. Гэта розныя рэчы.

Па-другое, у мяне на ўчастках усё будуецца па-свойму, цыклічнасць складае як мінімум год, а вясной нават спаць няма калі. У той жа час, калі ў раён прыходзіць нейкі чарговы цыркуляр, яго абавязкова павінны давесці да прыватнага прадпрымальніка асабіста, ды яшчэ і тэрмінова. Значыць, у разгар работы ўсё кідай і імчы ў райцэнтр? Але гэта, даруйце, глупства. Цыркуляр можа пачакаць, а зямля — не можа. Патрэцяе, адразу з'яўляецца процьма правяраючых, кожны з якіх вучыць цябе жыць. Навошта, з якой мэтай? Калі я буду дрэнна працаваць, я проста разаруся, і ніякія «цэнныя ўказанні» (якія таксама забіраюць сілы і час), мне не дапамогуць.

Атрымліваецца, што ты быццам бы і індывідуальны прадпрымальнік, але... ад усіх залежны. Не захацелі мы такога шчасця, не падыходзім мы пад гэту катэгорыю, таму і перайшлі на «вольны хлеб».

На думку Раманавых, сёння ў вёсцы практычна адсутнічаюць умовы для стварэння сярэдняга класа. Ёсць працадаўцы (у вельмі абмежаванай колькасці) і наёмная рабочая сіла. І калі, скажам, ты ўвайшоў у канфлікт з кіраўніком сельгаспрадпрыемства, нармальнага жыцця ўжо не атрымаецца. Трэба пераязджаць, шукаць іншае месца працы...

— Адсутнасць выбару — вось што ў першую чаргу штурхае людзей пакідаць вёскі і з'язджаць у гарады. Адсутнасць умоў для свабоднага развіцця. Вось захацеў я развівацца асабіста, і што?

Знаходзячыся ў незразумелым статусе «людзей, якія жывуць з падсобнай гаспадаркі», Раманавы нават неабходныя ўгнаенні не могуць набыць непасрэдна ў фірмы-пастаўшчыка — апошнія не маюць права працаваць з «індывідуаламі».

— І мы вымушаны купляць угнаенні ў магазінах, маленечкімі расфасоўкамі, пераплачваючы за кожную ўпакоўку ў два разы. Не кажучы пра тое, што многія віды ўгнаенняў увогуле нельга дастаць, хоць калгасам іх прадаюць... А тэхніка? Гора з ёю. Я каталогі замежныя купляю, цікаўлюся навінкамі ў гэтай галіне. У той жа Польшчы селянін-прыватнік саджае каліва пры дапамозе спецыяльнай пасадачнай машынкі. А я — рукамі, як і мой дзед сто гадоў таму... А калі б меў магчымасць узяць ільготны крэдыт — даўно механізаваў бы свою працу. А так... Рукі баляць, ногі баляць, са спіной праблемы і ў мяне, і ў жонкі... Але трымаемся — у надзеі дажыць да лепшых часоў.

Лепшыя часы, на думку Раманавых, настануць тады, калі такіх, як яны — тых, хто не толькі гандлюе сельгаспрадукцыяй, але і займаецца яе вырошчваннем — класіфікуюць і аб'яднаюць у адзіную суполку, вызначыўшы для іх прымальны падатак, а таксама надзяліўшы правамі і абавязкамі.

— З цягам часу, магчыма, я захачу стаць фермерам, бо сёння фермеры сапраўды маюць рэальныя магчымасці і адчуваюць падтрымку. Але да фермерства трэба дажыць, з гэтым не кожны справіцца — патрэбны не толькі стартавы капітал, не толькі аб'ёмы прадукцыі і плошчы, але і сучасная тэхніка, найноўшыя тэхналогіі вядзення гаспадаркі. На сёння такіх магчымасцяў у нас няма, — тлумачыць Генадзь Леапольдавіч.

«Варыянт», які прапануе Раманаў у дачыненні да прыватнікаў-сельгасвытворцаў, — гэта свабода дзеянняў (у межах адпаведнага заканадаўства) плюс цярпімыя падаткі. І, безумоўна, афіцыйны статус. Тады і будуць, на яго думку, створаны аптымальныя ўмовы для творчай работы на зямлі. Менавіта творчай, што Генадзь Леапольдавіч неаднойчы падкрэсліў падчас нашай размовы.

— У рэшце рэшт, з такіх, як мы, можна стварыць своеасаблівую школу фермерства, яго нізавую прыступку. Прайшоўшы праз яе, нехта знікне, а нехта ўзнімецца вышэй...

А пакуль гэтага няма, Раманавы ўсур'ёз заклапочаны тым, каб зарабіць сабе сродкі «на пенсію». Генадзь Леапольдавіч «захварэў» на новую ідэю — заняцца садаводствам, пакрысе адышоўшы ад агародніцтва. «Мая «пенсія» — гэта еўрапейскія гатункі яблыкаў і груш, — усміхаецца ён. — І, магчыма, вінаграду. На нашых палетках можна такі вінаград вырасціць — пальчыкі абліжаш!».

Сёння Раманавы лічаць, што дзяржава не выкарыстоўвае іх (і такіх, як яны) патэнцыял нават напалову.

— Стварыце ўмовы для айчыннага прыватнага сельгасвытворцы — і мы пацяснім на рынку замежных канкурэнтаў, вырасцім не горшую прадукцыю, — кажуць яны. І разам з тым прызнаюцца, што ў вёсцы, нават пры 20-гадзіннай занятасці, адчуваюць сябе чужымі, як «апошнія з магікан»...

Наталля КАРПЕНКА.

Слуцкі раён.

P.S. Калі нехта з нашых чытачоў зацікавіцца жыццёвай «філасофіяй» сям'і Раманавых ці захоча абмяняцца з імі сваім прафесійным вопытам, каардынаты можна будзе знайсці ў рэдакцыі (тэл. 292 21 03).

ПОПЫТ НА... ВЯСКОЎЦАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Па сутнасці, прадпрыемства доўгія гады проста жыло ў доўг. Вытворчыя магчымасці ў лепшым выпадку выкарыстоўваліся хіба толькі напалову. Калі да агульнага малюнка дадаць яшчэ досыць «праблемныя» землі (у дажджлівае надвор'е на палетку проста не «ўлезці»), то можна ўявіць сабе стартавыя ўмовы для інвестараў, якім перадалі гаспадарку.

— Так, справа для нас новая і незвычайная, — гаворыць генеральны дырэктар КУП «Віцебскабліндарбуд» Валерый Лаппо. — Аднак такі «сімбіёз» прамысловцаў і сельгасвытворцаў не з'яўляецца нечым звышнатуральным. Гэта еўрапейская практыка. Колькі часу таму я знаёміўся з вопытам вялікай французскай кампаніі, якая займаецца будаўніцтвам розных аб'ектаў (у тым ліку і аэрапортаў). Разам з тым яны і піва вараць, і хлеб вырошчваюць. З задавальненнем апрацоўваюць уласныя палеткі і правамерна лічаць такія актывы перспектыўнымі. Дык чаму б і нам не паспрабаваць свае сілы?

Першае, з чаго пачыналі — навядзенне элементарнай дысцыпліны. Неабходна было такім чынам адладзіць увесь тэхналагічны цыкл, каб вытворчасць сапраўды прыносіла аддачу. Толькі ў такім разе можна спадзявацца на станоўчы вынік. Зразумела, змены да лепшага ў адной з горшых гаспадарак Лёзненшчыны адбыліся не ў адзін момант. Аднак з прыходам інвестара вяскоўцы адчулі — з'явілася перспектыва, «віды» на будучыню. Варта толькі добра папрацаваць, каб у Кляўцах і бліжэйшай акрузе ўсё пайшло па-новаму.

Такі настрой людзей, напэўна, не менш важны фактар, чым фінансавая дапамога. Ужо колькі разоў даводзілася пераконвацца, што не толькі ўкладанні з'яўляюцца галоўнай умовай паспяховай «рэанімацыі» сельгаспрадпрыемстваў. У тых выпадках, калі калектыў не спрацаваў як мае быць, то і інвестыцыі не прыносілі карысці. «Закопваць грошы» ў вёсцы «Віцебскабліндарбуд» зусім не меў намеру, новыя гаспадары імкнуліся давесці да ладу вытворчасць, стварыць людзям належныя ўмовы для жыцця. І за чатыры гады многае ўдалося зрабіць. Прынамсі, многія тутэйшыя жыхары ў гэтым перакананыя. Праз некаторы час пасля пачатку пераўтварэнняў перад вачыма паўсталі ўжо зусім іншыя палеткі — зямля не зарастае пустаселлем. Інвестарам сапраўды ўдалося запусціць вытворчы механізм, цяпер усё працуе без збояў. Аднак гэта не азначае, што ўсё прайшло на адным дыханні. Працэс рэфармавання атрымаўся складаны. Не тое, што механізатараў і жывёлаводаў, а нават кіраўніцтва сельгасфіліяла доўгі час падбіраць давялося.

Не «дзедаўскім метадам»

Цяперашні старшыня «Кляўцоў» Аляксандр Снараў працуе тут крыху больш за два гады. Вопытны спецыяліст здолеў арганізаваць справу такім чынам, што адбываецца пастаянны прырост вытворчасці. Мяркуйце самі: пасля таго, як «Кляўцы» сталі структурным падраздзяленнем абласной дарожнай арганізацыі, пагалоўе жывёлы павялічылася больш чым удвая, а ўраджайнасць збожжавых сёлета дасягнула 35 цэнтнераў з гектара. Гэта пры тым, што палявыя работы на тутэйшай гліне заўсёды пачынаюцца на два тыдні пазней і, адпаведна, жніво зацягвецца. Сёлета, кажа старшыня, тут выдалася толькі тры тыдні пагодных дзянькоў. Тым не менш, сабралі прыстойны ўраджай — 2,1 тысячы тон. Усяго за адзін год «вал» збожжа павялічыўся на 583 тоны.

— Калі добра працаваць з зямлёй, выконваць палявыя работы ў жорсткай адпаведнасці з тэхналогіяй, то добры вынік будзе, — перакананы Аляксандр Снараў. — Ужо цяпер мы думаем пра ўраджай наступнага года. Унеслі мінеральных угнаенняў удосталь, адсеяліся ў належны тэрмін. Таму я ўпэўнены: налета хоць камяні з неба, а атрымаем не менш чым 40 цэнтнераў з гектара.

Такая ўпэўненасць старшыні перадаецца вяскоўцам, якія цяпер працуюць не за нейкія там цьмяныя абяцанні, а за канкрэтныя заробкі. Ды і тэхнікі ў гаспадаркі ўдосталь: закупілі новы «Кіравец», швейцарскія абаротныя плугі, нямецкую сеялку «Лемкен», найноўшы камбайн «Лексіён», ды і шмат іншага абсталявання. Адбудавалі майстэрні, сталовую, галоўны «офіс» гаспадаркі, адрамантавалі жывёлагадоўчыя фермы.

Некалькі месяцаў таму быў здадзены ў эксплуатацыю сучасны малочнатаварны комплекс на больш чым паўтысячы кароў. Цікава, што даільная зала тут айчыннай вытворчасці. Як перакананы Аляксандр Снараў, гэта зусім не горшы варыянт і не імкненне нейкім чынам эканоміць. Проста беларускае абсталяванне адпавядае ўсім патрабаванням па якасці, ды і запчасткі, належны сэрвіс у выпадку неабходнасці заўсёды без цяжкасцяў знойдзеш.

Новы комплекс — далёка не танное задавальненне (будаўніцтва і аснашчэнне «пацягнула» на 6 мільярдаў рублёў), але гэта дакладна той выпадак, калі ўкладанні апраўданыя. Вытворчасць малака ў «Кляўцах» адбываецца не «дзедаўскім метадам», а па самых сучасных тэхналогіях. Хоць і запусцілі комплекс толькі менш чым паўгода таму, а ўжо зараз ёсць канкрэтны вынік. Гаспадарка пачала здаваць малако не проста вышэйшага гатунку, а класа «экстра». Як вядома, такая сыравіна выкарыстоўваецца для вытворчасці сыроў, таму да яе асаблівыя патрабаванні. Зразумела, вяскоўцам прыемна, што яны здольныя прапанаваць перапрацоўшчыкам такую класную прадукцыю. Ды і кошт «экстра»-малака на парадак вышэйшы — 920 тысяч рублёў за тону супраць 770 тыс., якія плацяць за «звычайнае».

А кадры дзе?

Вытворчасць малака — сярод найбольш перспектыўных накірункаў. Штодня гаспадарка пастаўляе на Лёзненскі малаказавод каля пяці тон (улетку выходзіла і больш за шэсць). Для «Кляўцоў» гэта значны фінансавы «падмурак» — паводле слоў Аляксандра Снарава, толькі за мінулы месяц ад рэалізацыі малака атрымалі 118 мільёнаў рублёў. Хапае не толькі на выплату зарплаты, але і на бягучыя плацяжы. Ужо цяпер сельгасфіліял працуе няхай з мінімальным, аднак прыбыткам.

Старшыня ўпэўнены: трэба ўлічваць спрыяльную эканамічную кан'юнктуру, вялікі попыт на сельскагаспадарчую прадукцыю. Інвестыцыі ў АПК прыносяць добрыя «дывідэнды» — зразумела, у тым выпадку, калі грошы былі ўкладзены з розумам, па-гаспадарску. На працягу апошніх чатырох гадоў на развіццё «Кляўцоў» інвестар выдаткаваў каля 6 мільёнаў долараў. Сродкі, безумоўна, значныя, аднак з іх дапамогай удалося сапраўды не толькі вывесці з заняпаду стратную гаспадарку, але і стварыць эфектыўную, адладжаную вытворчасць, якая працуе па сучасных тэхналогіях.

Актыўна вядзецца будаўніцтва — узводзіцца шэсць домікаў, два з іх ужо здадзены ў эксплуатацыю. Гэта камфартабельнае, утульнае жыллё. Домікі цёплыя — таўшчыня сцен да 70 сантыметраў, таму ўзімку з абагрэвам ніякіх праблем не ўзнікае. Дарэчы, у катэджах устаноўлены зручныя ацяпляльныя катлы, якія могуць працаваць як на дровах (канструкцыя зроблена такім чынам, што падыходзяць нават доўгія паленцы), так і на вадкім паліве. Таксама ёсць і бойлер для падагрэву вады, якая цэнтралізавана падведзена да домікаў. Як бачым, для вяскоўцаў ствараюцца «гарадскія» ўмовы.

Толькі вось з кадрамі праблема — немагчыма знайсці патрэбных людзей сярод мясцовых жыхароў. З 80 чалавек, якія цяпер працуюць у «Кляўцах», 20 штодня прыходзіцца вазіць з райцэнтра. Гараджанам сельгасфіліял здаецца даволі прэстыжным месцам — высокія заробкі (на малочным комплексе работнікі ў сярэднім атрымліваюць каля 1 млн рублёў — фактычна за 15 рабочых дзён), сучасныя ўмовы працы. Дасюль гаспадарцы неабходны заатэхнік. Старшыня спадзяецца, што, можа, даедзе да іх талковы малады спецыяліст. Сярод неаспрэчных пераваг — першапачатковы заробак у 750—800 тысяч рублёў і рэальныя перспектывы з жыллём.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Лёзненскі раён.

ДОШКА НЕ ГОНАРУ, А ГАНЬБЫ

Вельмі цяжка змагацца з самагоншчыкамі. Іх штрафуюць, а яны штраф заплацяць і далей варыць сівуху і прадаюць, спойваюць вясковы люд. У Жабінкаўскім раёне 50-гадовую кабету аж 72 разы прыцягвалі да адміністрацыйнай адказнасці, а яна даходны промысел не пакідае. Ёсць і ў горадзе «актыўныя» пенсіянеркі — адну брастаўчанку таксама штрафавалі разоў пяць, але сцяжынка да яе дома не зарастае. Вось у абласным упраўленні УУС і вырашылі ганьбіць парушальнікаў правапарадку з дапамогай нагляднай агітацыі. 60 стэндаў з фотаздымкамі і прозвішчамі самагоншчыкаў установлены ўжо ў населеных пунктах дзесяці раёнаў вобласці.

Яна СВЕТАВА.

ГІМЕНЭЙ ПАКРЫЎДЗІЎСЯ...

За дзевяць месяцаў гэтага года ў мінскіх ЗАГСах зарэгістравана 12 525 шлюбаў. У параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года колькасць шлюбаў зменшылася на 860. Аб гэтым паведаміла начальнік аддзела архіва органаў, якія рэгіструюць акты грамадзянскага стану, Галоўнага ўпраўлення юстыцыі Мінгарвыканкама Аксана Дунько.

Магчыма, сваю ролю тут адыграла тое, што 2008 год высакосны. У народзе існуе меркаванне: такі год няўдалы для якіх-небудзь пачынанняў і, у прыватнасці, для ўступлення ў шлюб.

Святлана ФРАЛЯНКОВА, «Мінск—Навіны».

ДОЎГАЯ ДАРОГА Ў СТУДЗЯНЕЦ

Сельская ўлада выконвае штодзённыя просьбы людзей, але пабудаваць дарогу ёй не па сілах

...Акуратная хата, палісаднік з восеньскімі кветкамі, чысціня і парадак навокал. Ветэраны працы Святлана Аляксееўна і Міхаіл Яфімавіч Жмэйды — гаспадары ўзорнага домаўладання ў вёсцы Студзянец, якая месціцца непадалёк ад раённага цэнтра Касцюковічы і вядомая ў акрузе святой крыніцай.

...У пачатку 1960-х яны пазнаёміліся на танцах. Як смяецца цяпер Міхаіл Яфімавіч, будучай жонцы спадабаўся яго кучаравы чуб. Закахаліся, пажаніліся, выгадавалі траіх дзяцей. Усё жыццё адпрацавалі на адным месцы: ён — манцёрам сувязі, а яна — даяркай у мясцовым калгасе «Парыжская камуна».

— Цяпер мы дзесяць гадоў на пенсіі і вакол хаты справамі займаемся, — завяршаюць няхітрую гісторыю свайго жыцця гаспадары. — Зямлі шмат. Узараць-пасеяць-убраць. Збожжа, бульба, буракі, гарбузы... Дзяцей падтрымаць трэба, унукі падрастаюць, на праўнукай спадзяёмся.

— Жмэйды — адны з нямногіх людзей ва ўзросце, якія трымаюць жывёлу і вялікую гаспадарку, — каментуе старшыня Беладубраўскага сельскага Савета Касцюковіцкага раёна Мікалай Патапенка. — Пенсіянеры, якія жывуць адзінока, даўно пазбавіліся ад сваіх кароў. Маладыя вяскоўцы часта не хочуць трымаць жывёлу, а ў старых сілаў і здароўя няма.

Праца з пенсіянерамі і ветэранамі — гэта значная частка клопатаў сельскага Савета. Праўда, з такімі гаспадарамі, як Святлана Аляксееўна і Міхаіл Яфімавіч, у мясцовай улады праблем практычна няма. Жмэйды адразу заяўляюць, што крыўдаваць на жыццё ім не выпадае: пенсіі ў кожнага прыкладна 450 тысяч рублёў, ды яшчэ плюс сялянская звычка вечна працаваць забяспечваюць ім годнае жыццё, а мясцовае кіраўніцтва не застаецца абыякавым да праблем ветэранаў працы.

Але ў жыхароў Студзянца ёсць вялікая просьба да ўлады. «Мы хочам дарогу!» — так акрэсліваюць сваё жаданне пенсіянеры Жмэйды і іх суседзі.

— Наша вясковая вуліца — гэта гравійная дарога, — паказвае Святлана Аляксееўна. — Улетку, ды яшчэ ў сухое надвор'е, мы проста задыхаемся ад пылу. Справа не толькі ў забруджанасці вокнаў ды ў пыле «з палец» у пакоях — хоць штодня прыбірай. Дыхаць няма чым, і сесці адпачыць на лаўцы перад палісаднікам — гэта задавальненне не для нас.

— Тут у нас актыўны рух, — тлумачыць Міхаіл Яфімавіч. — Дровы вязуць, нафтавікі едуць, уся тэхніка ідзе. Хто яшчэ ціха едзе, ад таго не так шмат пылу. Але хто аўтамабіль не за свае грошы набыў, той выціскаць сотню кіламетраў за гадзіну не саромеецца. Калі прасілі ўсталяваць дарожныя знакі, нам адмовілі: маўляў, дарога не асфальтаваная, знакі не паложаны. Так і пакутуем.

— Мы звярталіся да ўлады, — зазначае жонка. — Вызначылася, што трэба пакласці 757 метраў дарогі. Абяцалі, што зробяць. Але так і не спраўдзіліся нашы надзеі.

— Будзем працаваць над гэтым пытаннем, — абяцае Мікалай Патапенка. — Праблема складаная, таму што патрабуе шмат грошай. Але думаю, дарогу ўрэшце зробім. Я буду імкнуцца дапамагчы і як дэпутат раённага Савета. Папросім падключыцца нашага нядаўна абранага дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Алега Сакандынца.

— Ва ўсім іншым улада нас не крыўдзіць, — гавораць Жмэйды. — Калодзеж нядаўна агарадзілі і вядро прывезлі. Даведку ў сельсавеце зробяць імгненна, ды яшчэ перададуць з паштальёнам, каб не марнавалі час на дарогу.

Дарога — гэта пытанне глабальнае, а працоўныя дні старшыні Беладубраўскага сельвыканкама запоўнены штодзённымі праблемамі, звязанымі з жыццезабеспячэннем састарэлых і адзінокіх людзей.

— Асноўны клопат восенню — гэта забеспячэнне палівам, — пачынае пералічэнне Мікалай Патапенка. — Дровы можна заказаць, усе за іх плацяць — што ж, нармальныя пенсіі гэта дазваляюць. А вось валку трухлявых дрэў (а апошнім часам стала шмат такіх заявак) аплачваем са свайго бюджэту.

Па звычцы людзі па любой праблеме спачатку звяртаюцца ў сельсавет. Таму тут па-ранейшаму дапамагаюць арганізоўваць уборку ўраджаю з прысядзібных участкаў. Штогод рамантуюць пячное ацяпленне і электраправодкі адзінокім людзям, якім не могуць дапамагчы дзеці.

Адзінокіх пенсіянераў даглядаюць сацыяльныя работнікі, а калі старыя становяцца зусім нямоглымі — сельсавет афармляе іх у інтэрнат. Аднак здараецца і так, што дзеці кідаюць бацькоў: калі бабулі і дзядулі жывуць зусім дрэнна і ім не хапае сродкаў, старшыні даводзіцца «выхоўваць» іх дарослых дзяцей.

— Нядаўна разбіраўся з такой гісторыяй, — расказаў Патапенка. — Дзеці забралі ў бацькі кватэру ў горадзе, а яму набылі хату на радзіме і адправілі яго ў вёску. І ўсё, з вачэй прэч. Чалавек гэты, здараецца, злоўжывае спіртнымі напоямі, але не кідаць жа яго аднаго! Я тэлефанаваў і пераконваў, што нельга так рабіць, а трэба прыязджаць і даглядаць чалавека. А яны адпраўляюць бацькоў у вёску і мяркуюць, што тут усіх прымуць і прытуляць. Так яно, безумоўна, урэшце і атрымліваецца. Але клопатаў нам хапае.

У сельвыканкамах лічаць, што да старых патрэбен асаблівы падыход. Не хаваюць, што часам іх патрабаванні — завышаныя. І, напэўна, справядліва кажуць: старыя што малыя, ім хочацца ўсяго адразу і паболей.

— Аднак для састарэлых людзей сельская ўлада робіць усё магчымае, — запэўніў Мікалай Патапенка. — Заўсёды адказваем, калі да нас звяртаюцца з просьбай ці скаргай. З пенсіянерамі трэба часта кантактаваць, каб яны не хвалявaліся па дробязях. Старыя людзі сёння не пакрыўджаны дзяржавай і не абдзелены ўвагай з боку мясцовай улады.

Ілона ІВАНОВА.

Касцюковіцкі раён.

...І ЯШЧЭ РАЗ ВУЧЫЦЦА!

— Нам трэба паглядзець, што зроблена, як на месцах вырашаюцца праблемы. Неабходна, каб семінар насіў аб'ектыўна-крытычны характар. Мы на месцы ўбачым рэальную карціну і зробім высновы, — сказаў у сваім кароткім выступленні перад сельскім і гарадскім актывам старшыня Ганцавіцкага райвыканкама Уладзімір Столяр, адкрываючы раённы семінар-вучобу.

Здавалася, што пра Ганцавіцкі раён ведаю ўсё, а тут трапіў на тэрыторыю ДРБУ-100 і ўбачыў, што жыццё не стаіць на месцы — не прадпрыемства, а элітная вайсковая часць. Тэхніка «пад шнурок», гаражы пафарбаваныя, і ўся тэрыторыя заасфальтаваная.

Зазірнулі ў памяшканні — і там парадак. Ёсць нават саўна з басейнам. (Паспрабавалі гаспадары спачатку прадастаўляць яе ўсім ахвотным, але неўзабаве адмовіліся. Не столькі таго заробку, як клопату, бо ў саўну пайшлі з горада не толькі папарыцца, але і павесяліцца).

Словам, прыйшоў у ДРБУ-100 талковы кіраўнік, і ў прадпрыемства з'явіліся напрацоўкі і перспектывы.

А яшчэ ўдзельнікі семінару наведалі аграгарадкі Хатынічы, Агарэвічы, Кукава, Любашаўскі сельскі Савет. Хатынічы тут стаяць асабняком, бо ўсе сацыяльныя аб'екты гэтай вёскі можна лічыць паказальнымі. Дом культуры хоць і малаваты, але зайсці сюды не сорамна, а галоўнае, што ён не пустое. Сярэдняя школа ў Хатынічах самая вялікая сярод сельскіх у раёне. Калі ёсць дзеці і моладзь, то ёсць сэнс і будавацца — вяселлі тут гуляюць амаль кожную нядзелю.

За 9 месяцаў 2008 года ў мясцовым аддзяленні «Беларусбанка» жыхары Хатынічаў узялі 71 крэдыт, праўда, у Агарэвічах яшчэ больш — 85.

Улічваючы, што ў Ганцавіцкім раёне няма нават свайго малаказавода, а не тое што горадаўтваральных прадпрыемстваў, становіцца зразумелым, як цяжка ўладам прафінансаваць будоўлю ці правесці рэканструкцыю нейкага аб'екта. Вось і даводзіцца максімальна прыстасоўвацца да сітуацыі. Напрыклад, у тых жа Хатынічах з закінутага магазіна райпа зрабілі бібліятэку. Будынак абшылі сайдынгам, пакрылі металачарапіцай... і вока радуецца. А галоўнае, што ёсць чытачы.

У Доме культуры, які знаходзіцца ў в. Кукава, таксама знайшлі аптымальнае вырашэнне пытання з мэбляй для глядзельнай залы — крэслы з гарадскога ДК перадалі сюды, у выніку пэўныя сродкі былі зэканомленыя. Так што гаспадарскі падыход, хоць часам і вымушаны, не зняты з парадку дня.

А калі ўсе апынуліся ў будынку Любашаўскага сельвыканкама, то ўспрынялі яго як узорны.

— Мясцовая ўлада абавязана выглядаць прыстойна, — пракаментаваў старшыня райвыканкама.

Сапраўды, сумна бывае бачыць сельсаветы, у якіх адчуваецца запусценне. Калі не пафарбаваны сцены і асыпаецца тынкоўка, то як у такім памяшканні рэгістраваць нараджэнне дзіцяці ці шлюб? Пад ЗАГС у Любашаўскім сельвыканкаме адпушчаны прасторны пакой. На падлозе дываны, светла, прысутнічае адчуванне ўрачыстасці. А гэта важны момант, бо здараецца, што ад знешняй чысціні і парадку павявае казённым холадам.

— Усё гэта мы зрабілі сваімі сіламі, — паведаў старшыня сельскага Савета Уладзімір Гардзей. — У нас 486 чалавек моладзі, так што трэба працаваць на будучыню.

Прывезлі актыў раёна і на ферму СВК «Дубнякі». Кіраўнік гаспадаркі Уладзімір Грыгаран расказаў, як яму ўдалося падняць надоі з 1400 да 5000 кілаграмаў ад каровы. Тут быў уведзены ўжо забыты сямейны падрад, сістэматычная работа са статкам, дастатковасць кармоў... Цікава, што ў гаспадарку ніхто не ўкладваў дадатковыя грошы — давялося разлічваць толькі на сябе.

А закончыўся выезд на адным з двароў па вуліцы Заводскай у райцэнтры. ЖКГ, лясгас і ДРБУ-100 сумеснымі намаганнямі прывялі гэты двор у парадак. Выкінулі «разнабойныя» агароджы, выкарчавалі кусты, паклалі асфальт, зрабілі дзіцячую пляцоўку — і двор не пазнаць.

Перавучыць дарослага чалавека, перайначыць яго — задача даволі складаная. Але прымусіць паварушыцца можна. Прыклад іншых падштурхоўвае да дзейнасці — хоць бы дзеля таго, каб застацца на пасадзе. А гэта стымул сур'ёзны.

Сымон СВІСТУНОВІЧ,

Ганцавіцкі раён.

«Беларускія сокі — з беларускіх ягад!»

Менавіта такі прынцып павінен быць у аснове работы нашай харчовай прамысловасці, лічыць намеснік старшыні праўлення Белкаапсаюза Іван Макоўскі.

За 9 месяцаў арганізацыі спажывецкай кааперацыі закупілі ў насельніцтва сельскагаспадарчай прадукцыі і сыравіны амаль на 144 млрд рублёў. Узраслі закупкі бульбы, гародніны, садавіны, ягад. Кошт на ягады, яблыкі, якія закупляліся, таксама ўзрос — ад 1,1 да 2,9 раза. Гэта прывяло да рэкорду па нарыхтоўцы чарніц — 4,4 тысячы тон. А гэта — рэальнае павышэнне даходаў вяскоўцаў.

Дарэчы, уся гэтая сыравіна праходзіць двухступеньчаты радыелагічны кантроль: правяраецца агульны фон нарыхтовак, пасля праводзяцца даследаванні ў спецыялізаваных лабараторыях.

Сёння ў Белкаапсаюзе паспяхова працуюць 12 перапрацоўчых прадпрыемстваў. На Маладзечанскім харчовым камбінаце, у Іванаўскім і Глускім райпо ўведзены тры лініі па вытворчасці хутказаморожанай прадукцыі. У Паставах наладжана вытворчасць салёных памідораў, агуркоў і іншай агародніны, а значыць, нашы суайчыннікі ўжо цяпер могуць бачыць у магазінах беларускія саленні ў зручнай тары рознага аб'ёму, а не замежныя, як было раней.

Перапрацоўчыя прадпрыемствы рэспублікі могуць ужо сёння ганарыцца 70 найменнямі айчынных сокаў, у хуткім часе плануецца прапанаваць спажыўцу і шэраг натуральных сокаў — без кансервантаў, без цукру. Усё гэта накіравана на мінімалізацыю экспарту сыравіны: айчынныя прадпрыемствы пераарыентаваліся на рэалізацыю сваёй прадукцыі за мяжу ўжо ў гатовым выглядзе. Гэта ў далейшым забяспечыць значную эканомію нашых дзяржаўных сродкаў на закупку гатовых прадуктаў з нашай жа сыравіны.

Вольга ДАМАРАЦКАЯ.

ИЗВЕЩЕНИЕ

о проведении открытого аукциона по продаже недвижимого имущественного комплекса – база отдыха, расположенного по адресу: Брестская область, Ивановский район, д. Завышье, ул. Завышанская, д. 14/2

Ивановское районное потребительское общество (Продавец) совместно с ЧУП «Белкооппроект» Белкоопсоюза (Организатор аукциона) проводят открытый аукцион по продаже недвижимого имущественного комплекса – база отдыха, расположенного по адресу: Брестская область, Ивановский район, д. Завышье, ул. Завышанская, д. 14/2

Состав имущественного комплекса:

Наименование строения, год постройки	Характеристика строения	Общая площадь строения
Дом № 1 1991	фундамент бетонный, наружные и внутренние стены сборно-щитовые, крыша шиферная, вентиляция естественная, скрытая электропроводка, оконные и дверные проемы простые, число жилых комнат — 2	общая площадь 22,9 кв.м жилая площадь 19,7 кв.м
Дом № 2 1991	фундамент бетонный, наружные и внутренние стены сборно-щитовые, крыша шиферная, вентиляция естественная, скрытая электропроводка, оконные и дверные проемы простые, число жилых комнат — 2	общая площадь 23,3 кв.м жилая площадь 19,8 кв.м
Дом № 3 1991	фундамент бетонный, наружные и внутренние стены сборно-щитовые, крыша шиферная, вентиляция естественная, скрытая электропроводка, оконные и дверные проемы простые, число жилых комнат — 2	общая площадь 22,2 кв.м жилая площадь 19,2 кв.м
Дом № 4 1991	фундамент бетонный, наружные и внутренние стены блочные, перекрытие чердачное ж/бетонное, крыша металлошифер, вентиляция естественная, скрытая электропроводка, оконные проемы двойные, двери филенчатые, камин, число жилых комнат — 6	общая площадь 159,7 кв.м жилая площадь 83,4 кв.м
Здание бани 1991	фундамент бетонный, наружные и внутренние стены кирпичные, чердачное перекрытие ж/бетонное, вентиляция естественная, скрытая электропроводка, оконные и дверные проемы простые, водопровод — трубы стальные, канализация — трубы чугунные	общая площадь 94 кв.м
Здание столовой 1991	фундамент бетонный, наружные и внутренние стены кирпичные, чердачное перекрытие ж/бетонное, крыша шиферная, вентиляция естественная, скрытая электропроводка, оконные проемы двойные, дверные проемы простые, водопровод — трубы стальные, установлен титан	общая площадь 65 кв.м

Общая площадь земельного участка для содержания и обслуживания недвижимого имущественного комплекса составляет 0,5256 га (решение № 651 от 27.11.2001 г.).

Начальная цена – 830 000 000 белорусских рублей с НДС.

Размер задатка составляет 5 % от начальной цены, сумма задатка 41 500 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет организатора аукциона – р/с 3012000003910 в ОАО «АСБ Беларусбанк», филиал 510 МФО 153001603, УНН 100105073 ОКПО 01790429 (в платежном поручении в графе «Назначение платежа» указывать: «Задаток согласно Условий проведения аукциона № 18-08 от 24.10.2008 г., без НДС»).

Аукцион состоится 04.12.2008 года в 14.00 по адресу: г. Иваново, ул. Первомайская, 6, актовый зал.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 03.12.2008 г. включительно с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, пр. Победителей, 17, 12-й этаж, каб. 1211.

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Плата за участие в аукционе составляет 257 290 белорусских рублей и перечисляется участниками на расчетный счет организатора аукциона (в платежном поручении в графе «Назначение платежа» указывать: «Плата за участие в аукционе согласно Условий проведения аукциона № 18-08 от 24.10.2008 г., в том числе НДС 18 %).

Вознаграждение организатора аукциона составляет 1 % от продажной стоимости объекта и уплачивается победителем аукциона (помимо оплаты за объект) на расчетный счет организатора аукциона в течение 3-х рабочих дней с даты проведения аукциона.

Для участия в аукционе юридическое лицо, гражданин или индивидуальный предприниматель (лично или через своего представителя) в установленный в извещении о проведении аукциона срок обязан предоставить следующие документы в адрес организатора аукциона:

- заявление на участие в аукционе;
- заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора аукциона;
- юридическим лицом — резидентом Республики Беларусь — доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;
- заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающую внесение платы за участие в аукционе в размере 257 290 белорусских рублей;
- индивидуальным предпринимателем — нотариально удостоверенную копию свидетельства о государственной регистрации;
- юридическим лицом — нерезидентом Республики Беларусь — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;
- представителем физического лица — резидента Республики Беларусь — нотариально заверенную доверенность, паспорт;
- физическим лицом — паспорт.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней с даты проведения аукциона. Право собственности на объект переходит от Ивановского райпо к победителю аукциона после полного расчета по договору купли-продажи объекта.

Объект продается без условий.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектом.

Контактные телефоны: (8017) 226 78 84; 226 94 83, (8029) 681 27 97, в г. Иваново (801652) 2 48 43, (8029) 642 48 43

ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»

«1» декабря 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 проводит аукцион

по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности Острошицкого сельского Совета, и права заключения договора аренды земельного участка, необходимого для его обслуживания

На аукционные торги выставляется предмет аукциона, включающий:

Школа с пристроенной столовой (инв. № 601/С-16024), расположенная по адресу: Минская область, Логойский район, д. Веснино, 1950 года постройки, общей площадью 413,5 кв.м. Одноэтажное здание, фундамент бетонный, стены и перегородки бревенчатые, перекрытия деревянные, крыша шиферная двускатная, полы дощатые, бетонные. Имеется печное отопление и электроснабжение	**Право заключения договора аренды земельного участка,** площадью 0,6157 га, сроком на 99 лет, отведенного для содержания и обслуживания недвижимого имущества
Мастерская (инв. № 601/С-16025), расположенная по адресу: Минская область, Логойский район, д. Веснино, 1985 года постройки, общей площадью 83,5 кв.м. Одноэтажное здание, фундамент бетонный, стены и перегородки бревенчатые, перекрытие деревянное, крыша шиферная двускатная, полы дощатые, бетонные. Имеется печное отопление и электроснабжение	

Начальная цена предмета аукциона 61 150 563 рубля (в том числе: имущество – 53 771 680 рублей и право заключения договора аренды земельного участка – 7 378 883 рубля).

Сумма задатка для участия в аукционе 4 500 000 руб.

Продавец недвижимого имущества: Острошицкий сельский исполнительный комитет, расположенный по адресу: Минская область, Логойский район, д. Острошицы, ул. Центральная, тел. (801774) 57636.

Арендодатель земельного участка: Логойский районный исполнительный комитет.

К участию в аукционных торгах допускаются: юридические лица, индивидуальные предприниматели, граждане Республики Беларусь и иностранные граждане, представившие в фонд «Минскоблгосимущество» в сроки, указанные в извещении, следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, также представитель должен иметь при себе паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации, представителем индивидуального предпринимателя дополнительно представляется нотариально удостоверенная доверенность;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, представителем иностранного юридического лица дополнительно представляется легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, а также паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

гражданином Республики Беларусь и иностранным гражданином – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, представителем гражданина Республики Беларусь и иностранного гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН:

1. В течение 10 рабочих дней со дня принятия Логойским райисполкомом решения о представлении победителю аукциона земельного участка возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией создания земельного участка.

2. Внести плату, взимаемую за право заключения договора аренды.

После совершения победителем аукциона действий, названных в пунктах 1, 2, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке Продавцом имущества заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а Арендодателем земельного участка – договор аренды земельного участка. Оплата по пунктам 1, 2, а также за недвижимое имущество должна быть произведена до 31 декабря 2008 года.

Фонд «Минскоблгосимущество» (организатор аукциона) имеет право снять предмет аукциона в любой момент до даты проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Все **расчеты по сумме задатка** производятся путем перечисления их на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» № 3642000000028 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.

Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 312, тел. 224 57 09. Последний день подачи заявок 28 ноября 2008 г. до 13.00.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка

Наименование предмета аукциона	Подсобное хозяйство и право заключения договора аренды земельного участка
Местонахождение недвижимого имущества	Брестская обл., Дрогичинский р-н, д. Горавица
Продавец недвижимого имущества	ГЛХУ «Дрогичинский лесхоз», (01644) 3 64 16, 3 64 20
Характеристика предмета аукциона	Коровник с весовой и сараем – 401,3 кв. м, 1987 г.п.; Свиноферма с пристройкой и водонапорной башней – 252,2 кв. м, 1992 г.п.; Зернохранилище – 307,9 кв. м. Земельный участок площадью 0,8121 га; срок аренды – 50 лет.
Начальная цена предмета аукциона, руб.	118 373 263
Сумма задатка, руб.	11 837 000
Организатор аукциона	*Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. (0162) 23 12 63, 20 87 85, 23 44 06, www.brest-region.by*

Аукцион состоится **2 декабря 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе представляются:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенные банком копии платежных поручений:

- о внесении суммы задатка на р/с 3642202530011 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНП 200020538;

- о внесении специального сбора за подачу заявления на участие в аукционе в размере 4 базовых величин и платы за регистрацию участников аукциона в размере 0,5 базовой величины на р/с 3600201000015 филиал № 100 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 246, назначение платежа 03107, УНП 200300543, получатель платежа – финансовое управление Брестского облисполкома.

3. Юридическими лицами – доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации.

4. Индивидуальными предпринимателями – нотариально заверенная копия свидетельства о государственной регистрации.

5. Иностранными юридическими лицами – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

6. Представителями иностранных юридических лиц или иностранных граждан, лиц без гражданства – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

7. Представителями граждан и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь – нотариально заверенная доверенность.

8. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь и представители иностранных юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Участник, ставший победителем аукциона, после проведения аукциона обязан:

подписать протокол аукциона;

не позднее 10 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и затраты на подготовку и проведение аукциона организатору аукциона, внести в местный бюджет плату за право заключения договора аренды земельного участка, выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка, после чего не позднее 2-х рабочих дней заключить с продавцом договор купли-продажи недвижимого имущества, а с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 года № 462.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 17.30 по рабочим дням по 1 декабря 2008 года включительно.

ГРОШЫ НЕ ЛЮБЯЦЬ МІТУСНІ...

Не панікаваць і не пераходзіць з адной крайнасці ў іншую

Нават падкаваным у фінансавых пытаннях людзям часам няпроста зарыентавацца ў той сітуацыі, якая складваецца зараз у свеце, у прыватнасці, з тымі ж валютамі і крэдытамі, і пралічыць верагодную перспектыву развіцця падзей. Што і казаць пра большасць насельніцтва, якое міжволі рэагуе на той крызіс, які ахоплівае краіны. Бадай, самае галоўнае, над чым ламаюць галаву многія — як з найменшымі стратамі (а лепш наогул без іх) пражыць перыяд патрасенняў на фінансавых рынках? І кожнае кампетэнтнае меркаванне па гэтым актуальным пытанні — шмат каштуе. Таму сёння сваім поглядам на апошнія падзеі дзеліцца з чытачамі «Звязды» першы намеснік старшыні праўлення ААТ «ААБ Беларусбанк» Валянціна ЛУК'ЯНЕНКА.

ЕЎРА ВЯРТАЕЦЦА?

Адна з найбольш абмяркоўваемых апошнім часам тэмаў — ажыятажны попыт на наяўныя долары ў абменніках. Між іншым, нешта падобнае сёлета ўжо ў краіне было, калі гэтак жа людзі скуплялі еўра: курс еўра шматабяцальна рос, і насельніцтва пазбаўлялася ад амерыканскай валюты на карысць еўрапейскай. Цяпер — усё наадварот. Паводле звестак Валянціны Захараўны, свой «уклад» у ажыятаж вакол долараў унеслі і грамадзяне сумежных з нашай краінай дзяржаў: ва ўмовах уведзеных пэўных абмежаванняў на тэрыторыі Расіі і Украіны, суседзі, прыязджаючы да нас, таксама скупляюць USD, і тым самым «падаграваюць» сітуацыю і павялічваюць нагрузку на беларускія банкі. Між іншым, рост попыту з боку насельніцтва на долары той жа «Беларусбанк» адчуў ужо 17 кастрычніка. І каб захаваць свае пазіцыі на рынку наяўнай валюты, прыняў пэўныя меры. У прыватнасці, касы банка і абменныя пункты аператыўна падмацоўваюцца неабходнай валютай. Акрамя таго, банкам выкарыстоўваецца такі шлях, як прапанаванне кліентам безнаяўных долараў з наступным залічэннем ва ўклады, плацежных дакументаў (чэкаў Амерыкан Экспрэс, якія намінаваныя ў доларах, і не толькі забяспечваюць захаванасць грашовых сродкаў, але і даюць магчымасць у далейшым іх абнаявіць). Дарэчы, у апошніх выпадках продаж валюты ажыццяўляецца па больш прывабных для кліентаў курсах.

Аднак, падобна, на рынку наяўнай валюты нешта мяняецца. Прынамсі, калі браць у разлік тое, што ў абменных пунктах таго ж «Беларусбанка» ў апошнія тры дні ўзрос попыт на еўра. Цікавасць людзей да гэтай валюты павялічылася разам з ростам курсу еўра на сусветных рынках. Напрыклад, два дні таму насельніцтва набыло на 1,5 мільёна наяўных еўра больш, чым было здадзена ў «абменнікі» банка. Наогул, што датычыцца куплі-продажу валюты, то тут Валянціна Лук'яненка раіць беларусам не панікаваць і не пераходзіць з адной крайнасці ў іншую. «Не трэба пераводзіць свае зберажэнні з адной валюты ў іншую: у такім выпадку страты ад хістання курсаў будуць мінімізаваныя», — лічыць яна. І дадае, што неабходна ўсё ж такі захоўваць свае зберажэнні ў банку, таму што стаўка даходнасці па ўкладах — станоўчая і абараняе грошы ад інфляцыі.

КАБ НЕ ЗГУБІЦЬ ДАХОД...

Дарэчы, пра ўклады. Як бачна з той сітуацыі, якая цяпер складваецца ў адным з сістэмаўтваральных банкаў краіны, альтэрнатывы дэпазітам насельніцтва не шукае: людзі па-ранейшаму давяраюць фінансавай установе і працягваюць захоўваць тут свае зберажэнні. Больш за тое, у банку істотна папаўняюцца і новыя рахункі. За два тыдні толькі на ўклад «Прэстыж», які нядаўна ўвёў банк, укладчыкі прынеслі 250 мільярдаў беларускіх рублёў, 50 мільёнаў долараў, 30 мільёнаў еўра і 80 мільёнаў расійскіх рублёў. Праўда, цяпер больш чым калі супрацоўнікам «Беларусбанка» (што не дзіўна) даводзіцца адказваць на званкі кліентаў, якіх цікавіць, напрыклад, ліквіднасць банка і яго магчымасці па выкананні абавязацельстваў па даговорах банкаўскіх укладаў па першым запатрабаванні. Як зазначае Валянціна Лук'яненка, занепакоенасць людзей сёння цалкам зразумелая але, у прыватнасці, «Беларусбанк» заўсёды няўхільна выконвае абавязацельствы. І не толькі па сваіх дагаворах банкаўскага ўкладу: многія, мяркуем, памятаюць сумнавядомыя «Белбалтыю» і «Комплексбанк», укладчыкам якіх менавіта «Беларусбанк» датэрмінова вярнуў зберажэнні.

Між іншым, спецыялісты лічаць неапраўданымі і дзеянні тых нямногіх укладчыкаў, якія пачынаюць мітусіцца, здымаць грошы з рахункаў у банках. Чаму? Адказ, на думку Валянціны Лук'яненка, відавочны: пры датэрміновым скасаванні дагавора ўкладчыкі губляюць практычна ўвесь даход, бо банк пералічвае даход па паніжанай працэнтнай стаўцы. Да таго ж, павучальны ў гэтым сэнсе вопыт тых, хто ўжо аднойчы патрапіў у пастку ўсеагульнай панікі. Усе, бадай, добра памятаюць падзеі лістапада 2006 года. Тады, нагадаем, чуткі аб дэнамінацыі рубля справакавалі ўкладчыкаў кінуцца ў банкі па свае зберажэнні. У выніку людзі згубілі працэнтныя даходы па дэпазітах. А праз некаторы час, пасля «прасвятлення», ім зноў са сваімі грашамі давялося вяртацца ў банкі і размяшчаць зберажэнні ва ўкладах.

«АПЕТЫТЫ» СПАЖЫЎЦОЎ ЗАДАВАЛЬНЯЮЦЦА

Аналізуючы сітуацыю з крэдытаваннем, калі многія банкі скарацілі яго аб'ёмы і павялічылі працэнтныя стаўкі па крэдытах насельніцтву, Валянціна Лук'яненка падкрэсліла, што ў «Беларусбанку» такіх праблем не існуе. Наадварот, у кастрычніку крэдытаванне насельніцтва банкам нават вырасла ў параўнанні з вераснем: калі ў верасні ўстановы банка штодзённа прадстаўлялі каля 5 мільярдаў рублёў, то ў кастрычніку — амаль 6 мільярдаў.

«Хачу заспакоіць перш за ўсё тых, каго турбуе пытанне па выдачы льготных крэдытаў на будаўніцтва ці набыццё жылля. Яны выдаюцца ў поўным аб'ёме ў адпаведнасці з заяўкамі», — паведаміла Валянціна Лук'яненка. Акрамя таго, банк без цяганіны выдае крэдыты і на рамонт жылля, на газіфікацыю, на навучанне, маладым спецыялістам, якія прыступілі да працы пасля заканчэння ВНУ і сярэдніх спецыяльных устаноў, а таксама і іншыя сацыяльна значныя віды крэдытаў. Прычым, адзначыла Валянціна Захараўна, працэнтныя стаўкі па згаданых крэдытах у беларускіх рублях не змяніліся. Як, дарэчы, ніякіх новаўвядзенняў няма і па тэрмінах разгляду заявак па крэдытах. Разам з тым на 1-2 працэнтныя пункты былі павялічаны стаўкі па крэдытах на спажывецкія патрэбы ў сувязі са зніжэннем стаўкі рэфінансавання і павелічэннем памеру працэнтнага даходу па ўкладах насельніцтва.

Адказваючы на пытанне наконт магчымага ўвядзення больш жорсткага падыходу банка да заявак на выдачу крэдытаў насельніцтву, Валянціна Лук'яненка заўважыла, што такой неабходнасці няма. «Самае галоўнае — мы павінны паглядзець, ці забяспечаны крэдыт, ці будзе ён вернуты. Гэта асноўны крытэрый, які дзейнічае пастаянна», — адзначыла яна.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

(о проекте строительства жилого дома № 3 по генплану в квартале жилой застройки с объектами соцкультбыта по ул. Притыцкого)

Информация о застройщике:

Совместное белорусско-польское предприятие общество с ограниченной ответственностью «Строминвест-М», расположенное по адресу: г. Минск, ул. Короля, 20-1.

Режим работы: понедельник – пятница 9.00 – 18.00, обед – 13.00 – 14.00.

Зарегистрировано Министерством внешних экономических связей Республики Беларусь от 29 апреля 1997 года № 40 в реестре общереспубликанской регистрации за № 1490 (регистрация изменения наименования МИД 21 июля 2000 г. № 1490/1) и присвоен ЕГР № 101264892.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:

1.	Жилой дом № 1б по ул. Ольшевского
2.	Жилой дом № 1а по ул. Ольшевского
3.	Жилой дом № 2, корпус 1 по ул. Притыцкого

Информация о проекте строительства:

1. Цель проекта — строительство многоквартирного жилого дома.

Начало строительства — 1-й квартал 2008 г., окончание строительства — 2-й квартал 2009 г. Положительные заключения Главгосстройэкспертизы № 1576-5/08 от 07.07.2008 г., государственной экологической экспертизы № 332 от 24.11.2004 г. и № 02-6/797 от 18.04.2008 г.

2. Местоположение строящегося многоквартирного жилого дома — г. Минск, застройка квартала с объектами соцкультбыта по ул. Притыцкого, жилой дом № 3 по генплану.

Характеристика объекта. Объект — 119-квартирный, 17-этажный жилой дом со встроенными помещениями. Стены: наружные выше отметки 0,000 – поэтапно опертая кладка из блоков ячеистого бетона п СТБ 1117-98 (В1,5, D 500, б=400 мм) на клею с креплением к несущим конструкциям. Наружные стены подвалов – монолитные железобетонные толщиной 200 мм с утеплением на глубину промерзания пенополистирольными плитами. Лестничные марши – монолитные железобетонные. Перемычки – сборные железобетонные по серии Б 1.038.1-1 и ячеистого бетона ОАО «Забудова». Вентшахты – сборные по серии Б1.189-7, перегородки – из блоков ячеистого бетона по СТБ 1117-98, кирпича керамического пустотелого и кирпича полнотелого одинарного по СТБ 1160-99 в санузлах. Кровля – плоская рулонная с внутренним водостоком из наплавляемых материалов кровельных по СТБ 1107-98. Отопление — центральное. Электроснабжение — скрытая проводка.

Цены на объекты долевого строительства

Стоимость 1 м² общей площади объекта долевого строительства — 4126200 (четыре миллиона сто двадцать шесть тысяч двести) руб.

3. Права застройщика на земельный участок подтверждает решение Мингорисполкома № 3083 от 27 декабря 2007 г. Правообладателем земельного участка является СП ООО «Строминвест-М» (свидетельство о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права постоянного пользования на него от 8 февраля 2008 г. № 500/727-1432). Кадастровый номер земельного участка 500000000006004128, площадь – 0,6776 га. Благоустройство — согласно проектной документации.

4. Количество квартир в доме — 119.

5. Проектом предусмотрено размещение нежилых помещений в многоквартирном жилом доме в подвале (филиал сотовой связи и магазин «Цветы») и на первом этаже (два магазина одежды № 1 и № 2, два блока офисных помещений), которые не являются местами общего пользования.

6. Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

7. Предполагаемый ввод в эксплуатацию — 2 квартал 2009 г.

8. Строительство дома осуществляется застройщиком с привлечением подрядной организации СП «Строминвест» ООО, имеющей лицензию Министерства архитектуры и строительства Республики Беларусь № 02250/0195219 на право осуществления деятельности «Проектирование и строительство зданий и сооружений I и II уровней ответственности и проведению инженерных изысканий для этих целей». Лицензия продлена на основании решения от 21.08.2006 г. № 172 сроком на 5 лет и действительна до 21.08.2011 года.

Условия ознакомления застройщиком дольщиков с объектом долевого строительства и ходом работ по строительству можно узнать по телефону отдела реализации: 204 43 14.

УНН 101264892

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» по поручению Озерицко-Слободского сельского исполнительного комитета Смолевичского района

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов:

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь земельного участка	Наличие инженерных сетей	Начальная цена (рублей)	Задаток (рублей)
1	Смолевичский район, д. Малое Залужье 624883006601000079	0,1500 га	сети электроснабжения	1 899 000	180 000
2	Смолевичский район, д. Скураты 624483009101000105	0,1500 га		2 415 000	240 000

Задаток перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы в сумме 1 120 740 рублей, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона (по каждому лоту). Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документацией и земельными участками. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **04.12.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 03.12.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

З суботы — «новае» паляванне

З першай суботы лістапада ў краіне «стартуе» чарговы асенне-зімовы сезон паляванне на пушных паляўнічых жывёл усімі дазволенымі спосабамі — загонам, з засады, з падыходу, у тым ліку з паляўнічымі сабакамі. Доўжыцца ён будзе, згодна з Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і паляванне, да апошняй нядзелі студзеня.

Падчас сезона можна будзе паляваць на андатру, зайца-беляка і зайца-русака, лясную і каменную куніцу, ляснога тхара, амерыканскую норку, гарнастая, ласку, звычайную вавёрку. У светлы час сутак будзе дазволена здабываць жывёлу любога полу і ўзросту.

Адначасова па 15 снежня працягваецца летне-асенні сезон палявання на вадаплаўную і баравую дзічыну, перапёлку, вальдшнэпа, галубоў шызых і вяхіра, рабчыка і шэрую курапатку; асенне-зімовы сезон палявання на лася, высакароднага аленя, дзіка, казулю любога полу і ўзросту ўсімі дазволенымі спосабамі — загонам, з засады, з падыходу, у тым ліку з паляўнічымі сабакамі, на зайцоў з ганчакамі і хартамі (якія маюць палявы дыплом), а таксама на бабра і выдру.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПАРАНІЎ ЖАНЧЫНУ... ШЫЛАМ

У хірургічнае аддзяленне Віцебскай абласной клінічнай бальніцы шпіталізавана 47-гадовая рабочая. Прывезлі яе параненую са сваёй кватэры на «хуткай». Шылам параніў брат яе былога мужа. За што — высвятляюць следчыя. Узбуджана крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

У Беларусі не назіраецца сістэмных банкаўскіх праблем

Аб гэтым журналістам паведаміў намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Васіль Мацюшэўскі.

Ён нагадаў, што ў свеце ўжо больш за паўтара года працягваюцца фінансавыя цяжкасці. У нашай краіне функцыяную адкрытая эканоміка. Апошнія падзеі на сусветных фінансавых рынках адбіваюцца і на магчымасці атрымання крэдытаў грамадзянамі нашай краіны. Разам з тым беларускімі банкамі крэдыты па-ранейшаму выдаюцца. Так, у асобных банках змяніліся ўмовы выдачы крэдытаў, павялічыліся працэнтныя стаўкі па іх. Банкі сталі больш уважліва разглядаць плацежаздольнасць крэдытаатрымальнікаў. Ці збіраецца галоўная фінансавая ўстанова краіны дапамагаць банкам? Васіль Мацюшэўскі запэўніў, што на сёння беларускія банкі ў якой-небудзь сістэмнай падтрымцы патрэбы не маюць. Адказваючы на пытанні журналістаў, спецыяліст падкрэсліў, што ў банках краіны не існуе праблемы куплі наяўных валют. Так, два тыдні таму долар істотна ўмацаваўся ў параўнанні з іншымі валютамі. Гэта выклікала хвалі пераводаў адных валют у другія, дзе ў схеме прысутнічаў і беларускі рубель. Тады ў асобных абменных пунктах маглі ўзнікаць выключна тэхнічныя праблемы па канвертацыі амерыканскай валюты. Долары ў банках ёсць у неабходнай колькасці, Нацбанк цалкам кантралюе сітуацыю, удакладніў Васіль Мацюшэўскі.

Сяргей КУРКАЧ.

ІВАН — ПІЛІПАЎ СЫН

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Колькі б ні прыязджаў у Столінскія Цераблічы, заўсёды застаю Івана за працай. Заўсёды ён пры справе: хату прыбудоўвае, самаробны трактар рамантуе. Гэтым разам пілаваў дошкі на цыркулярцы. Адрываць ад хатніх спраў вясковага жыхара няёмка, але гаспадар, збіваючы пыл з вопраткі, кажа: «Працу ніколі не пераробіш». Запрашае ў хату і першай справай садзіць госця за стол, шчодра сілкуе і толькі тады вядзе ў музей, дзе ён і дырэктар, і навуковы супрацоўнік, і аўтар мноства драўляных скульптур. Ён жа калекцыянер і захавальнік мноства прадметаў цераблiцкай даўніны.

Музей этнаграфіі і побыту — такая афіцыйная назва музея, які пачынаўся некалі пад дахам вясковай бібліятэкі — трыццаць шэсць гадоў ёю загадваў Іван. Каб аздобіць інтэр'ер памяшкання, ён ставіў сваё разьбярства сярод кніжных паліц і па кутах. Вяскоўцы прыходзілі не толькі пагартаць газеты і ўзяць дахаты кніжку, але і паглядзець на «сякерную» работу бібліятэкара, бо Іван у драўляных скульптурах паказваў сваіх аднавяскоўцаў, хоць ніколі знарок не падкрэсліваў іх падабенства, самасабою атрымлівася. Партрэты былі пазнавальнымі. А сякеры і сапраўды хапала, каб бервянцовы кавалак «ажываў» канкрэтным вясковым персанажам. Цераблянам падабаўся гэты своеасаблівы вясковы летапіс, бо Іван-летапісец паказваў найперш сялянскую долю і паляшуцкую вынаходлівасць, увогуле ён заўсёды славіў простага чалавека за яго працу і цярпенне.

У драўляных выявах сябе пазнавалі ваенныя ўдовы, сейбіты, жнеі, пчаляр-бортнік, палясоўшчык і дрывасек, рыбак, вясковыя музыкі... Некалькімі дакладнымі рухамі сякеры ў яго атрымліваецца зрабіць твар чалавека і падкрэсліць на ім ці ўсмешку, ці задумны настрой. Але галоўнае, разьбяру заўсёды ўдаецца перадаць душэўны стан героя, а гэтага ўдаецца дасягнуць не кожнаму майстру. Цяпер бібліятэка знаходзіцца ў іншым месцы, а музейная экспазіцыя запоўніла ўсю залу і складаецца з некалькіх дзясяткаў з малых, з далонь, да вялікіх, у рост чалавека, скульптур. Колькі ж увогуле зрабіў іх насамрэч, майстар не ведае. Ён нават не імкнуўся весці хоць якую-небудзь храналогію. Колькі тут унікальных рэчаў колішняга паляшуцкага побыту, якімі валодаюць нават не кожны дзяржаўны музей! Напрыклад, ёсць вогнікі для здабывання агню, якім не менш за 200 гадоў, ці драўляныя лыжы для паляўання, таксама надзвычай старажытныя. Каб увесці ў музейную прастору, Іван пачынае расповед з калекцыі размаляваных скульптур пад назвай «Радаводы вёскі», дзе кожная фігура абазначае пачынальніка роду. Столькі радаводаў у адной вёсцы сустракаць мне яшчэ не даводзілася. А якая моўная смаката чуць і прамаўляць гэтыя старажытныя назвы(!): Борысы, Клубы, Казакі, Ковбасы, Мовсее, Аўсяе, Кормільцы, Стральцы, Макады, Мельнікі, Ліхваны, Погоды, Хвеські, Карпы, Кашэўскія. Як сведчыць легенда, якую Іван адрадзіў і абавязкова ўсім распавядае, цераблiцкія радаводы адпаведна рысам характару вызначыў мудрэйшы з жыхароў Ліхван Ліхваня. З радаводнага букета складаецца і сённяшняе насельніцтва Цераблічаў — амаль 1200 чалавек.

Сам жа Іван паходзіць па матулінай галіне з роду Кашэўскіх, па бацькавай належыць да Стральцоў. Але свайго таты Іван не памятае — ён загінуў на вайне, калі сыну было толькі і роўна два гадочкі. Іван нарадзіўся 23 кастрычніка 1942 года, а 23 кастрычніка 1944-га Піліп Фядотавіч Супрунчык забіты пад Зялёнай Гурай. Узрост яго быў трыццаць чатыры гады.

«Перад адыходам на фронт тата патрымаў мяне на руках, сказаў, што можа ў апошні раз бачыць», — перадае Іван матуліны ўспаміны. Бацька быў добрым скрыпачом, і старэйшыя жыхары дагэтуль памятаюць, як ён іграў на вяселлях. Іван заўсёды ганарыўся гэтай творчай акалічнасцю роду, што і яму перадалася ад продкаў кропля таленту.

Маляваць хлопчык пачаў рана, гадоў з васьмі, а ў дзевяць ці дзесяць зрабіў першую скульптуру. Гэта быў бюст... Сталіна. Юны мастак заўсёды хадзіў з папкай і нешта маляваў. Але выбіцца ў вялікі мастакоўскі свет хлопцу не дазвалялі абставіны. Трэба было дапамагаць маці. Што павінен быў рабіць бацька, легла не толькі на братоў, але і на яго плечы. У вёсцы чалавека паважалі не затое, што ўмее маляваць ці спяваць, а як ён спраўляецца на сваім падворку. Нарыхтоўка дроў, сена, агародніцтва і будоўля — усё ўмелі і рабілі Іванавы рукі. Нездарма кола яго мастацкіх вобразаў адлюстроўвае зразумелае яму народнае жыццё. Як сапраўдны гаспадар, ён нічога не рабіў выпадкова, без неабходнай жыццёвай мудрасці. Захапленне разьбярствам было арганічным спалучэннем працы і адпачынку, калі можна такое паняцце прымяняць да стыхіі колішняга вясковага жыцця.

Адной з першых Іванавых прац, па-сапраўднаму ацэненых аднавяскоўцамі, сталі помнікі-скульптуры франтавікам, якія не вярнуліся з вайны. Ля сядзібы, дзе жыла салдацкая маці захавалася пазелянелая ад часу кампазіцыя з трох салдацкіх выяў і партрэт жанчыны, якая чакае з вайны сваіх трох сыноў Кастуся, Яфіма і Васіля. Помнік-сімвал паставіў Іван і каля сваёй хаты, дзе побач з выявай салдата ёсць выява скрыпкі. Гэта вобраз яго бацькі, твар якога Іван ведаў толькі па адзіным фотаздымку. З вайны ў Цераблічы не вярнуліся 44 мужчыны...

На многіх прысядзібных Іванавых помніках па цераблiцкай традыцыі павязаныя стужкі. Звычайна стужкі павязваюцца на Радаўніцу. Я бачыў іх і на крыжах формы мальтыйскага ордэна, якія яшчэ захаваліся на старых вясковых могілках. І на помніку Іванавай маці — вялікай драўлянай скульптуры на новых могілках. Гэты помнік — апошняе, чым майстар яшчэ раз цікава нагадаў пра сябе. І зроблены ён у непаўторным Супрунчыкавым стылі, той жа адзінай сякерай, з тым жа глыбокім пачуццём сынавага абавязку. Тым больш што маці Аксіння Сцяпанаўна, якая пражыла 88 гадоў і 44 з іх была ўдавою, прасіла не ставіць на яе магіле каменны помнік.

«Я доўга шукаў у лесе дрэва, знайшоў гэты дуб і зрабіў», — без філасофскіх разважанняў кажа Іван пра стварэнне помніка, хоць без філасофскіх алегорый яму не абысціся, бо ў руках жанчына трымае скрутак палатна. «Гэта дарога, сатканая яе жыццём», — тлумачыць майстар.

У верасні-кастрычніку насельніцтва Цераблічаў жыве сезоннымі клопатамі — нарыхтоўкай журавінаў. У асноўным гэта справа жанчын. Яны ідуць і едуць на балота не так і далёка — усяго за 15-20 кіламетраў, каб за дзень управіцца. Пад Мерлінскія хутары дабіраюцца толькі тыя, хто збіраецца на тыдзень і тым больш на месяц. Як правіла гэта ўкраінцы, якія едуць на журавінавыя заробкі цэлымі сем'ямі. Асноўная дарога і на Мерлінскія хутары, і на Альманскія балоты праходзіць якраз праз Цераблічы. Гэта была адзіная дарога на колішні авіяцыйна-бомбавы палігон Варшаўскага Дагавора. Па ёй эвакуявалі ў 60-х гадах хутарское насельніцтва з балот, завозілі тэхніку для мішэняў і расцягвалі хто мог тую ж тэхніку — аўтамабілі, танкі, самалёты — пасля вываду палігона з карыстання. Было гэта ў сярэдзіне дзевяностых. Цяпер дарогай карыстаюцца лясгас і паляўнічыя, за Сцвігаю нарыхтоўваюць сена і пасуць грамадскі статак цераблянe. Пад самы вечар па высокай насыпанай дарозе ў вёску брыдуць з поўнымі катомкамі ягадніцы. Як мінімум за плячыма ў кожнай 20 кіло журавінаў. Іх ужо чакаюць нарыхтоўшчыкі. На фоне адсутнасці працы гэта не горшы сродак для папаўнення сямейнага бюджэту. Хто-хто, а «керкуны» не губляюць дадаткавай, а для кагосьці і адзінай крыніцы зарабіць. Вясною Цераблічы заўсёды падпірала паводка, але пасля апошняй вялікай вады ўвесну 1999 года раку Моству адвялі ад вёскі і з паўднёвага боку насыпалі дамбу. Цяпер цераблянам застаецца з сумам прыгадваць непаўторную колішнюю прыгажосць — абмялелая рака нагадвае канаву.

«Калісьці тут вадзіліся мядзведзі, нашы продкі былі добрымі стральцамі і ўдзельнічалі ў Радзівілаўскіх паляваннях, магчыма таму старая частка Цераблічаў мае назву Стральцы», — разважае Іван і бярэ ў рукі яшчэ адзін унікальны экспанат невядома якіх часоў — драўляны паляўнічы рог. Гук з рога аксамітны, крыху глухаваты, нібы асіплы голас гісторыі. Але хто яго сёння чуе і разумее, як Іван Супрунчык?.. Добра і тое, што яшчэ ў таго-сяго на гарышчы захоўваюцца вось такія экспанаты. Іван Пілліпавіч усміхаецца і нясе рог на месца.

А вёска гэтым часам жыве сваім традыцыйным і звыклым жыццём: бягуць са школы дзеці, сумуе каля камерцыйнага кіёска прадавачка, будаўнік Генадзь Петрусевіч рамантуе суседу комін, а трохгадовы хлопчык Міша з цікаўнасцю пазірае, як яго дзед праворвае агарод... Гэта тое, што заўважыў я мімаходзь, праязджаючы з канца ў канец вёскі, ад Стральцоў да новага «мікрараёна» з «прэзідэнцкімі» дамамі. А колькі можна было б яшчэ ўбачыць, затрымайся тут даўжэй. Іван распавёў пра вясельны абрад, які бытуе ў Цераблічах. Маладога за вясельным сталом садзяць на падушкі, а маладая пакрывае галаву «сарпанком» — найтанчэйшага ткання хусткай. Гэтым сарпанком звязваюць маладых, каб моцнай была сям'я. Мо таму і сапраўды сем'і тут рэдка распадаюцца. Уяўляю сабе малюнкі колішняга жыцця, цікава намаляваныя Іванам на паперы і выстаўленыя ў музеі. Калі дзяўчыне спаўнялася 12 гадоў, бацька садзіў яе на калёсы, вазіў па сяле і казаў, што дзеўка ўжо «паспела», прасіў прысылаць сватоў. А павітуху ў Цераблічах і летам, і зімою вазілі толькі на санках. І гэты сюжэт таксама не застаўся па-за творчымі інтарэсамі мастака. На жаль, многія звычаі нават у глыбокім Палессі згубіліся і не запатрабаваныя ў сучасным жыцці, але Іван іх «рэстаўруе» ў сваіх малюнках і скульптурах, бо, хто ведае, ці не вернуцца да іх наступныя пакаленні, каб не быць насельніцтвам без роду і племені. За ўнікальнасць і творчае вырашэнне захавання мінуўшчыны музею Івана дзевяць гадоў таму прысвоена званне «народнага», а сам Іван — член Саюза народных майстроў — за шматгадовую творчасць у 2000 годзе быў адзначаны спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта нашай краіны.

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.09	16.37	9.28
Віцебск —	7.02	16.23	9.21
Магілёў —	6.59	16.27	9.28
Гомель —	6.51	16.28	9.37
Гродна —	7.23	16.53	9.30
Брэст —	7.19	16.58	9.39

Месяц

Першая квадра.
Месяц у сузор'і Стральца.

Імяніны

Пр. *Златы, Андрэя, Іосіфа, Лукі, Сяргея, Юльяна.*

К. *Антаніны, Аўгуста, Вольфганга, Лукі, Сатурніна, Урбана.*

Дзве даты

31 кастрычніка

1917 год — у Мінску адкрыўся з'езд воінаў-беларусаў Заходняга фронту, а таксама прадстаўнікоў Паўночнага і Румынскага франтоў, Балтыйскага флоту. З'езд выказаўся за аўтаномію Беларусі, за адкрыццё нацыянальнага ўніверсітэта і іншых вышэйшых навучальных устаноў.



1517 год — Марцін Лютэр абвясціў у Вітэнбергу 95 рынцыпаў з нагоды рэфармацыі царквы. Пачатак Рэфармацыі (пратэстантызму) у Еўропе. У 1510 годзе манаху Марціну Лютэру прышлося асабіста назіраць амаральнасць папскага двара і рымскага духавенства. У 1516 годзе, у сувязі з чарговай актывізацыяй продажу індульгенцый (спецыяльных грамат, у якіх гаварылася, што чалавек, які купіў іх, вызваляўся ад кары за грахі), Лютэр выступіў з крытыкай гэтай з'явы. Завязаўся моўны падынак паміж папскай уладай і Лютэрам, якому пагражаў касцёр інквізіцыі. Манаха адлучылі ад царквы, і толькі заступніцтва некаторых уплывовых рыцараў, князёў, широкага кола грамадскасці Германіі выратавала яго ад смерці. Рэфармацыя праз некалькі дзясяткаў гадоў атрымала широкае распаўсюджанне і на беларускіх землях.

Цытата дня:

«Часам дастаткова сказаць адно слова, каб стаць бессмяротным. Толькі трэба ведаць, дзе сказаць яго».

Аляксандр Дзюма (сын) (1824—1895), французскі пісьменнік.

ДАРОГА

СВЕТ І СУСВЕТ ЧАЛАВЕКА

Дарога ў культуры ўсходніх славян была надзелена мноствам рытуальных функцый. Яна заўсёды асацыявалася з жыццёвым шляхам, таму нашы продкі казалі, што ў кожнага з нас «свой» шлях. Дарога была яднальным шляхам паміж светам жывых і светам памерлых. Аб паміраючым чалавеку казалі, што ён стаіць на «смяротнай» дарозе і забаранялі турбаваць яго слязьмі і галашэннямі, каб ён «не сышоў са свайго шляху».

● Дарога стала тым месцам, дзе часам вызначаўся лёс чалавека, яго доля, поспех, шчасце. Гэта праяўлялася ў шэрагу прыкмет, звязаных з неверагоднымі абставінамі, напрыклад, з варожбамі-прадказаннямі аб надвор'і, паводзінамі каня, тымі сустрэчамі, якія былі на яго шляху (з чалавекам, святаром, жывёламі і г.д.).

● Поспех на шляху прадказвалі сустрэча з каровай, сабакам, воўкам, чалавекам, які нёс поўныя вёдры вады, бедняком; няўдачу — сустрэча са святаром, цяжарнай жанчынай ці парадзіхай, з чалавекам з пустымі вёдрамі, пахавальнай працэсіяй, кошкай, зайцам, змяёй.

● Дарога — гэта месца, дзе жывуць міфічныя героі, якія ці пужаюць вандроўніка, ці дапамагаюць яму не сысці са шляху, адшукаць шлях дадому: лесуны, сустрэчныя, дарожныя цар і царыца, «дарожны жах», чэрці... Пад выглядам вандроўніка ці заблукалай жывёлы (пеўня, парсюка) іх саджаюць у калёсы, і чалавек знікае ў царстве смерці назаўжды.

● Асаблівым аб'ектам увагі ў народнай культуры стала перакрыжаванне дарог, усемагчымыя разгалінаванні, месцы перакрыжавання дарог і воратаў, межаў вёскі, мастоў і іншых перашкод і рубяжоў.

● На рэчы, якія кантактавалі з хворым чалавекам (кашуля, ручнік, манета, яйка і інш.), «пераводзілі», «адсылалі» хваробы, а пасля іх выкідалі на дарогу, таму нельга падымаць з дарогі невядомыя рэчы, асабліва люстэрка (яго маглі трымаць над памяршым чалавекам, каб удакладніць, памёр ён ці не).

● Выключэннем стала падкова (яна з'яўляецца неад'емным атрыбутам дарогі), знайсці якую азначала «падняць з дарогі сваё шчасце».

● Каб пазбавіць чалавека ад болю ў спіне, у яго на паясніцы «секлі» лапаць, які зноў-такі выкідалі на дарогу.

● На працягу года дзяўчаты варажылі аб сваім лёсе. Часцей за ўсё варожбы пераносіліся на дарогу. У калядныя вечары яны выходзілі на дарогу і ў першага стрэчнага пыталіся яго імя, частавалі блінамі ці пірагамі; лічылася, што так будуць звяць жаніха. Напярэдадні Івана Купалы дзяўчаты шукалі каля дарогі трыпутнік, зрывалі яго вуснамі і клалі пад падушку, каб у сне ўбачыць суджанага. На дарогу выкідалі чаравік і назіралі, у які бок ён паляціць носам, — з таго боку і жаніха неабходна чакаць.

● З прыходам хрысціянства статус дарогі набыў дадатковыя якасці — на ёй сталі праводзіць хрэсныя хады. Гэта не магло не адбіцца на практыцы лячэбнай магіі. Лічылася, што калі хрэсны ход пройдзе праз покрыва, у якое загортвалі хворае дзіця, хвароба адступіць. З той жа мэтай на дарогу перад хрэсным ходам кідалі хусткі ці частку адзення, у якое быў апрануты хворы чалавек, «каб хвароба прайшла, як прахадзіць па дарозе хрэсны ход».

● Каб у хаце на працягу года было чыста (г.зн. не з'яўліся тараканы, клапы), у Чысты чацвер да ўзыходу сонца старанна вымяталі хату, смецце спальвалі, а попел выкідалі ў каляю пры дарозе.

● Пры небяспецы эпідэміі дарогу перакрывалі, каб «не пусціць» хваробу ў вёску. Для гэтага рабілі ручнік-абыдзённік (яго павінны былі выткаць некалькі жанчын-удоў за адзін дзень) і сцялілі яго ўпоперак дарогі, рыссыпалі насычаную дзёгцем пільніцу, старыя лапці і іншыя рэчы.

● І сёння ў вёсках існуе звычай перакрываць дарогу маладым пасля вянчання сталом, часткай агароджы ці плота, стужкамі, ручнікамі, патрабуючы ў маладога выкуп за праезд па дарозе, якая вядзе іх у новае жыццё.

● У абрадава-магічнай практыцы славянскіх народаў у выключных выпадках выконвалі абрад разворвання ці баранавання дарогі: каб выклікаць дождж, калі высахлі крыніцы, калодзежы, калі ў вёсцы быў мор, доўга не нараджаліся дзеці. Лічылася, што разворванне абуджае пладаносную моц зямлі.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

«Зіма вечная» на Зялёнай вуліцы!»

Чытачы ўзнімаюць праблему

«Звязда» атрымала калектыўны ліст ад жыхароў вёскі Амбросавічы Шумілінскага раёна. Больш за дзесяць вяскоўцаў, якія жывуць у двухпавярховых дамах на вуліцы Зялёная, паскардзіліся, што холадна ў іх кватэрах.

Вось цытата з ліста: «Ужо 18 гадоў, як нашы дамы адключаны ад цэнтральнага ацяплення. Выратоўваючыся ад холаду, людзі паставілі ў кватэрах ацепляльныя шчыты, ад якіх мала карысці ў моцныя маразы, і яны рэальна небяспечныя для жыхароў першых паверхаў»...

Людзі ўзрушаныя тым, што на фасадах іх дамоў вісяць так званыя пашпарты з указаннем мінімальных тэмператур цяпла — плюс 18 і вады — плюс 50. Значыць ЖКГ абавязана забяспечваць гэты дзяржаўны стандарт! А ў сапраўднасці?

Аўтары маглі б, безумоўна, каб сагрэцца, уключаць газавыя пліты, ды няма ў іх дамах такога камунальнага шчасця ў адрозненне ад жыльцоў такіх жа дамоў, што па суседстве: «У іх няма лічыльнікаў газу, а плацяць капейкі. Нам жа кожны балон каштуе больш за трыццаць тысяч...»

Куды толькі ні звярталіся вяскоўцы са сваёй праблемай! Адзначылі, што пісалі старшыні райвыканкама, і ў аблвыканкам, дэпутату абласнога Савета... Вось цяпер папрасілі дапамогі ў «Звязды».

Па каментарый аўтар гэтых радкоў звярнуўся да некалькіх афіцыйных асобаў раённага ўзроўню. Высветлілася, што сапраўды праблема існуе. Старыя камунікацыі па цеплазабеспячэнні прыйшлі даўно ў непрыдатнасць, страты былі вялікія...

Але зацягваць станоўча выражэнне праблемы з цеплазабеспячэннем цяпер не збіраюцца. Зараз вядуцца праектныя работы. Дарэчы, імі займаецца ўжо другая па ліку група праекціроўшчыкаў — з Лепеля, бо першая ў «Віцебскаблгазе» спаслалася на вялікую занятасць. Сапраўды, прыродны газ гады тры таму падведзены толькі да трох домаў, а ў яшчэ трох — карыстаюцца газам у балонах.

— Мы ж і дахі домоў адраманцавалі, швы ўцяплілі, — гаворыць намеснік старшыні райвыканкама Віктар Мядзведскі, які курыруе пытанні будаўніцтва. — Баюся сёння называць канкрэтныя тэрміны, але да канца першага квартала наступнага года, думаю, пастараемся вырашыць пытанне — за кошт устаноўкі ва ўсіх кватэрах індывідуальных газавых катлоў. Уявіце сабе, што адпаведна давядзецца і прыродны газ да іх падвесці, і сантэхнічныя камунікацыі ў гэтых кватэрах «зманціраваць» па-новаму.

— Напэўна, дорага гэта будзе каштаваць?

— Ну, у сярэднім мільёнаў пяць на адну кватэру. Пры гэтым колькі спецыяльнай дакументацыі трэба афармляць, рыхтаваць, узгадняць. Вядома ж, усё будзе зроблена за дзяржаўны кошт. Усяго спатрэбіцца, калі не памыляюся, каля мільярда рублёў...

Як гаворыцца, Масква не адразу будавалася? Гэта, напэўна, датычыцца і незадаволенасці жыхароў праблемамі добраўпарадкавання. Думаю, што пасля вырашэння газавага пытання ўлады не забудуць і на апошняе.

А вось незадаволенасці наконт чарговага рамонту будынка райвыканкама, што адзначылі аўтары ліста, ды ацяплення летніка для дзяцей, што побач, і перасялення калгаснікаў у добрае жыллё (цытата — «Некаторыя мянялі жыллё па 2—3 разы»), што тут сказаць? Зайздросціць — не самая лепшая справа і, адназначна, няправільны шлях для вырашэння ўласных цяжкасцяў. Хочацца, каб чыноўнікі працавалі ў шэрым, непрыглядным будынку? Гэта ж твар улады! А зімой трэба, каб лагер вымерз? А камбайнеры і іншыя лепшыя спецыялісты, думаю, маюць права на клопат. Яны ж кормяць краіну, якая паралельна зарабляе на экспарце прадукцыі!

Безумоўна, не трэба забываць і пра ўсіх, як гэта робіцца ў добрай сям'і. Ну дык праект рыхтуецца, і катлы паставяць. Хоць у ідэале хочацца, каб было хутчэй.

А яшчэ, думаецца, што калектыўны ліст у «Звязду» можна лічыць «узорным» у сэнсе таго, што на месцах трэба навучыцца гутарыць з людзьмі, тлумачыць ім усе нюансы, прапанаваць супрацоўніцтва па тых жа пытаннях добраўпарадкавання, як гэта робіцца ў некаторых сельсаветах, іншых структурах прадстаўнічай і выканаўчай улады. І, верагодна, не будуць яны нікуды скардзіцца...

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

АДНАК ТЭНДЭНЦЫЯ

У Баранавічах затрыманы хыжар в. Ястрэмбель, які хацеў абмяняць у аддзяленні «Беларусбанка» 50 еўра — грошы аказаліся фальшывымі.

А ў гэты ж дзень, 24 кастрычніка, у г. Бяроза затрымалі яшчэ аднаго жыхара в. Ястрэмбель, які таксама хацеў збыць фальшывую купюру коштам у 100 еўра. Узбуджаны крымінальныя справы.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

СКАСАВАНЫ МАРШРУТЫ

На падставе рашэння Мінгарвыканкама ў работу камунальнага пасажырскага транспарту ўносяцца пэўныя змяненні.

Так, з 10 лістапада закрываюцца аўтобусныя маршруты № 12 і № 82 Д. Змяняецца траса аўтобуснага маршрута № 82 з рухам па вуліцах Брылеўскай, Аэрадромнай, Дзянісаўскай на ўчастку ад вуліцы Казінца да вуліцы Маякоўскага.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДОМ ДЛЯ ВЯЛІКАЙ СЯМ'І

Вялікая сям'я ў дзень навасялля.

Восем сацыяльных сірот з Жыткавіцкага раёна перасяліліся ў новы дом сямейнага тыпу. Іх будаўніцтва прадугледжана як адзін з накірункаў у рэалізацыі Прэзідэнцкай праграмы «Дзеці Беларусі». Новы дом стаў пятай падобнай установай на Гомельшчыне.

Прыёмныя бацькі — Любоў і Вячаслаў Зарэцкія — самі выгадавалі траіх дзяцей і вырашылі, што засталіся сілы, каб дапамагчы ўладкавацца ў жыцці яшчэ пяці хлопчыкам і тром дзяўчынкам. Любоў Антонаўна доўгі час працавала медсястрой у нядаўна расфарміраванай Жыткавіцкай школе-інтэрнаце, часта брала дзяцей да сябе на выхадныя дні, а потым разам з мужам яны прайшлі спецыяльны курс у мясцовым сацыяльна-педагагічным цэнтры.

Выканаць мару дзяцей — жыць вялікай і дружнай сям'ёй — дапамаглі прадстаўнікі дабрачыннай арганізацыі «Бяроза» з Італіі. Чатыры сям'і з гэтай краіны штогод прымалі маленькіх беларускіх грамадзян на адпачынак. Менавіта для іх італьянскім бокам і быў куплены ў Жыткавічах двухпавярховы катэдж коштам 70 мільёнаў беларускіх рублёў і зроблены рамонт. На выдзеленыя італьянскімі партнёрамі сродкі ў памеры 6 тысяч еўра ў доме праведзены ўнутраныя будаўнічыя работы, побач з домам закладзены сад. Зараз дом абсталяваны, як кажуць, «пад ключ», а самы апошні падарунак — ад мясцовых уладаў — камп'ютар, дапаможа стасункам з усім светам, у тым ліку з італьянскімі спонсарамі.

Цяпер на Гомельшчыне 5500 дзяцей-сірот. З іх 70 працэнтаў пражываюць ужо ў сем'ях. Сёлета плануецца адкрыць яшчэ два дамы сямейнага тыпу — у Рагачове і Лоеве.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Усміхнёмся!

— Бяляшыкі гарачыя, бяляшыкі гарачыя!

— Бабуля, а з чым беляшы?

— Затое гарачыя!

☺

Дзве сяброўкі:

— Ну як муж?

— Ой, я такая шчаслівая! З тых часоў, як пажаніліся, мы яшчэ ні разу не пасварыліся. Хоць бы і другі тыдзень прайшоў так жа!

☺

Пан, будзьце ласкавы прасіць прабачэння, інакш мой муж выкліча вас на дуэль! Прычым дуэль будзе рускай, ён прыйдзе з натоўпам і вас проста пабʼюць!

☺

З крыкам: «Гэта павінен быў іграць я!» Гоша Куцэнка спрабаваў улезці ў экран падчас фільма «Піраты Карыбскага мора».

☺

— Алё, морг? Гэта вы тут у заяўцы патрабуеце дзесяць новых халадзільнікаў?

— Так, мы.

— Яны што ў вас там — пастаянна ядуць, ці што?

☺

Сапёр і электрык памыляюцца толькі адзін раз, але электрык перад смерцю яшчэ і танчыць.

ОРГАНИЗАЦИЯ ОКАЗЫВАЕТ УСЛУГИ ПО ГРУЗОПЕРЕВОЗКАМ а/м МАЗ
с полуприцепами до 20 тонн.
ВОЗМОЖНА ПЕРЕВОЗКА ЗЕРНА, КОМБИКОРМОВ.
Лиц. № 02190/0415315 от 17.12.2007 г.
Действительна до 16.12.2012 г.
УНП 690610346.
Тел. 8 017 289 09 15, моб. 8 029 66 55 084.

У вытворчасці суда г. Наваполацка маецца грамадзянская справа аб аб'яўленні памерлым **Бурлако Мікалая Рыгоравіча,** 1947 года нараджэння, ураджэнца в. Мірза-Акі Узгенскага раёна Ошскай вобласці Рэспублікі Кіргізія, які пражываў у г. Наваполацку, п. Баравуха, вул. Азёрная, д. 58.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра грамадзяніна Бурлако М.Р., паведаміць іх суду г. Наваполацка Віцебскай вобласці на працягу двух месяцаў з моманту апублікавання аб'явы.

ПАНЯДЗЕЛАК, 3 ЛІСТАПАДА

5.30 Дак. фільм «Дзікае паляванне».
6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00,19.00, 23.55 Навіны.
6.05, 7.10, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
6.45, 7.45, 18.50, 0.50 Зона Х.
7.30, 8.25, 11.50 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам.
8.30 У свеце матораў.
9.05, 15.25 «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
9.10 Nota Bene.
9.35 Здароўе.
10.05 Жаночае ток-шоу «Жыццё як жыццё». «Ці лёгка кахаць зорку?».
11.00, 17.50 Серыял «Родныя людзі».
12.10 Меладрама «Родныя і блізкія».
14.05 «Аляксандр Саладуха «Кахаць цябе, родная».
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.30 Культурныя людзі.
16.05 Гульнявое шоу «Інтуіцыя».
16.55 Серыял «Лялькі ведзьмака».
19.35 Арэна.
20.00 Ток-шоу «Ход у адказ».
21.00 Панарама.
21.50, 1.50 Серыял «Доктар Хаўс».
23.05 Драма «Зорка».
1.00 Дзень спорту.
1.10 «Хакей для ўсіх».

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 22.55, 3.00, 5.00 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.10 «Дыханне планеты».
10.45 Ералаш.
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.10, 3.20 Навіны спорту.
11.10 Маст. фільм «Кітайскі сервіз».
13.10 Серыял «Якія згубілі сонца».
14.05 «Модны прыгавор».
15.05 «Хірамант». Серыял.
16.15 «Бітва гарадоў».
17.30 «Жарт за жартам».
18.20 Серыял «Хто ў доме гаспадар?».
19.00 «Аркадзь Арканаў. «Раяль у кустах».
20.00 Час.
21.05 Ток-шоу «Выбар».
22.00 «След». Серыял.
23.15 «Адваротны адлік». «Каралеўская раць. Трагедыі і тайны».
23.50 «Уся каралеўская раць». Серыял. 1-я серыя.
1.10 «Футбол. Чэмпіянат Бразіліі. Сантас — Палмейрас».
3.30 — 5.00 Прафілактыка.
5.05 «Няхай гавораць».

6.55 Ранішняя падзарадка.
7.55, 16.55 Смачна з Барысам Бурдой.
8.25 Тэлебарометр.
8.45 Усё аб бяспецы.
9.15 У гэты дзень.
9.20, 16.05 Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
10.05, 17.30 Серыял «Спадчынніца».
11.00 Камедыя «Гордзі».
12.35 Слова пісьменніка.
13.00 «Спорт. Спорт. Спорт...» Вадзім Бекбулатаў.
13.30 Мультфільм.
13.55 Бухта капітанаў.
14.35 Мультсерыял «Новыя прыгоды Віні-Пуха».
15.00 Пазакласная гадзіна.
15.10 Гіпноз.
18.35 Навіны культуры.
18.50 Серыял «Участак».
20.05 Беларуская часінка.
21.05 Калыханка.
21.25 Экспедыцыя.
21.30 Маст. фільм «Шчыт і меч». 1-я серыя.
23.10 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
0.10 Хакей. Формула гульні.

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30,19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.40 «Раніца. Студыя добрага настрою».
8.30 «Тыдзень».
9.30 «Вялікае сняданне».
10.00 «Пяць гісторый».
10.40 «Наша справа».
10.50 «Жыццё працягваецца». Серыял.
11.45, 18.25 «Трое супраць усіх 2». Серыял.
12.35 «Ваенная тайна».
13.50 «Мой дом».
14.20 «Горад дзяцінства».
14.35, 0.10 «Крутыя рабяты».
15.35 «Я — падарожнік».
16.00 «Культурнае жыццё».
16.50 «Спартыўны тыдзень».
17.30 «Званая вячэра».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
20.15 «Добры вечар, малы».
20.30 Маст. фільм «Мужчынская інтуіцыя».
23.00 «Салдаты. Дэмбельскі альбом». Серыял.
0.05 «Закон і крымінал».
0.20 «Сталічны футбол».
0.50 «Гучная справа».

5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00 Навіны Садружнасці.
5.05, 6.05, 7.05, 1.05, 2.30 Садружнасць live.
5.30 «Жаночы часопіс».
6.35 «Удачная пакупка».
6.45 «Цік-так».
7.30 «Агульны інтарэс».
8.05, 1.30 Дак. серыял «Падводная адысея каманды Кусто».
9.05 «Разам».
10.05 Маст. фільм «Нявідочная чацвёрка».
12.30, 23.20 Маст. фільм «Завяшчанне старога майстра. Скарб Чынгіз-Хана».
14.05 Мультсерыял «Рэдвал».
14.30 Серыял «ОБЖ».
15.20 Дак. серыял «Дзіўнае жыллё».
15.55 «Білет на сёння».
16.05, 4.00 «Гадзіна суда. Справы сямейныя».
17.05 Серыял «Каханне як каханне».
18.20 Акцэнты.
18.30 Серыял «Скарб мёртвых».
19.30 «Агульны інтарэс».
20.05 Ток-шоу «Спрэчная тэрыторыя».
21.20, 3.00 Серыял «Астрог. Справа Фёдара Сечанава».
22.30 Дак. фільм «Кома гэта праўда».

7.00, 10.50, 16.55, 19.45 Навіны кіно.
7.10 «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
7.25, 23.35 «Метэапрагноз».
7.30 Камедыя «Нічога не бачу, нічога не чую».
9.00 «Клуб-700».
9.20 «К-гульні».
9.30 «К-відэа для дзяцей».
9.50 Серыял «Борджыа».
11.00 Серыял «Сям'я Кардзье».
12.15 «8 самых».
13.00 «Дзённы тэлечат».
16.30 «Мультпарад».
17.00 Серыял «Свавольнікі».
17.30 Серыял «Лейтэнант Каломба».
19.15 «Мой любімы гадаванец».
19.50 Серыял «Закон Мэрфі».
20.45 «Вечарніца».
20.55 «К-відэа» для ўсёй сям'і.
21.00 Інфармбюро «Міжнароднае».
21.05 Трылер «Які выганяе д'ябла».
23.20 «Кіно—кліп—парад».

7.00 «Несыграныя ролі». Таццяна Ерамеева.
7.45 Маст. фільм «Прыстань на тым беразе».
8.50 Маст. фільм «Малеча».
10.30 «Падарожжы музыканта».
11.00, 14.00, 19.00 Весткі.
11.15 Пакой смеху.
12.25 Маст. фільм «Кафедра». 1-я серыя.
13.50, 16.50, 18.50, 23.05 Навіны—Беларусь.
14.15, 22.30 «Кулагін і партнёры».
14.50 «Справа Кальцова». Дак. фільм.
15.50 Суд ідзе.
17.00 «Алег Басілашвілі. Вяліка гульня». Дак. фільм.
17.55 «Жанчына без мінулага». Серыял.
19.25 Серыял «Чараўніцкае каханне».
20.30 Серыял «Самая прыгожая».
21.30 Серыял «Асенні дэтэктыў».
23.15 «На чырвонае святло. Аляксандр Дзядзюшка». Дак. фільм.

7.00 Маст. фільм «Гаспадар «Імперыі».
8.45 Камедыя «Зорная камандзіроўка».
10.00, 13.00, 19.00, 3.00 Весткі.
10.10 Весткі—Масква. Тыдзень у горадзе.
10.45, 17.25, 0.45 «Родныя людзі». Серыял.
11.30, 18.15, 1.30 «Жанчына без мінулага». Серыял.
12.15 «Вакол свету».
13.15 Маст. фільм «Выпадковы спадарожнік».
14.50 Канцэрт Двойчы Чырванасцяжнага Акадэмічнага ансамбля песні і танца Расійскай арміі імя А.В. Аляксандрава.
16.05, 4.05 «На чырвонае святло. Аляксандр Дзядзюшка».
16.55, 6.25 «Засадны полк». «Яраслаў Смелякоў».
19.20, 2.15 Серыял «Чараўніцкае каханне».
20.05, 3.20 Серыял «Асенні дэтэктыў».
20.50, 4.50 Камедыя «Неідэальная жанчына».
22.25 «Смяяцца дазваляецца».
0.00 «Астравы». Марына Ладыніна.

6.15 Дак. фільм «Смута».

7.10 «Сёння. Падагульняючая праграма».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 «Сёння».
8.15 «Рускія сенсацыі».
9.00 «Рускія не здаюцца!».
9.30 «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
10.20 «Галоўны герой».
11.20, 13.20, 16.20 Серыял «Псеўданім «Албанец».
19.45 Баявік «Смерш».
22.05 Баявік «Самаволка».
0.10 Серыял «Лічбы».

4.45, 9.10, 11.40, 14.30, 18.05, 20.30, 0.10, 2.00, 3.50 Маст. фільм.
6.30 Марш-кідок.
7.00 АБВГДэйка.
7.30 Праваслаўная энцыклапедыя.
8.00 «Жывая прырода». «Вадапой».
8.45, 18.00 «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
10.30, 13.30, 16.30, 20.00, 23.55 Падзеі.
10.50 Георгій Міляр. «Уся нячыстая сіла».
13.45 «Сусветная гісторыя здрадніцтва». «Разбітыя сэрцы».
16.45 Пятроўка, 38.
17.00 «У цэнтры ўвагі». «Офісны планктон».
23.00 Момант ісціны.

9.30 Мотаспорт па выхадных.
9.45 «Ралі Японіі».
10.15, 0.45 Футбол. Афрыканская Ліга чэмпіёнаў.
12.00 Марафон. Нью-Ёрк.
13.00 Футбол. Кубак свету. Жанчыны (U-17).
15.00 Футбол. Афрыканская Ліга чэмпіёнаў. Першыя матчы. Фінал.
16.45 Тэніс. Жусцін Энен.
17.15 Тэніс. Чэмпіянат WTA.
19.00, 0.00 Футбол. «Еўрагалы».
19.45 Вось гэта дзіва!!!
20.00 Снукер. Зала славы.
21.00 Байцоўскі клуб.

23.05 ФІЛЬМ ДНЯ

«ЗОРКА» (РАСІЯ, 2002 г.)

Лета 1944 года. Чырвоная Армія вядзе баі на подступах да заходняй граніцы СССР. У тыл ворага накіроўваецца група разведчыкаў, маладых хлопцаў. Іх пазыўныя — «Зорка». Яны павінны выканаць заданне, ад якога залежыць лёс фронту.

Рэжысёр — Мікалай Лебедзеў. **У ролях:** Ігар Пятрэнка, Аляксей Краўчанка, Аляксей Панін, Арцём Сямакін, Юрый Лагута, Амаду Мамадакаў, Анатоль Гушчын.



АЎТОРАК, 4 ЛІСТАПАДА

5.05, 15.40 Серыял «Тайны следства».
6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
6.02, 7.05 Прэс-агляд.
6.05, 23.45 Дзень спорту.
6.15, 7.10, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
6.45, 7.45, 18.50, 0.00 Зона Х.
7.30, 8.30, 11.50 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам.
8.35 Арэна.
9.05, 14.55 «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
9.10, 19.55 Серыял «Мантэкрыста».
10.10, 16.45 Серыял «Лялькі ведзьмака».
11.00, 17.45 Серыял «Родныя людзі».
12.10 Гадзіна суда. Справы сямейныя.
13.05 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні».
